БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ ФОНД ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»

УДК 338.45 (476+438)
№ ДР 20042890
Інв. №

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Рэктар БДТУ, прафесар

_____ І.М. Жарскі

" _____ "_____ 2006 г.

СПРАВАЗДАЧА

аб навукова-даследчай рабоце

«РАСПРАЦОЎКА МЕТОДЫКІ ВЫЗНАЧЭННЯ МЕСЦАЗНАХОДЖАННЯ І ХАРАКТАРЫСТЫК ПРАМЫСЛОВЫХ КЛАСТЭРАЎ У БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ»

(заключная)

Дагавор з БРФФД № Г04МС–035 ад 3 мая 2004 г.

Навуковы кіраўнік НДР, к.э.н. _____ У.У. Валетка

" _____ "_____ 2006 г.

Нормакантралёр _____ Л.В. Філосаф

" _____ "_____ 2006 г.

Мінск 2006

Рэферат

Справаздача 137 с., 24 мал., 35 табл., 65 крыніцаў, 6 дадаткаў.

ГАЛІНОВЫЯ КЛАСТЭРЫ, КАНЦЭНТРАЦЫЯ, ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ, ПАКАЗАЛЬНІК РАЗМЯШЧЭННЯ, АНКЕТАВАННЕ

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца прадпрыемствы лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай і хімічнай і нафтахімічнай галінаў прамысловасці Беларусі і іх тэрытарыяльныя канцэнтрацыі (кластэры).

Мэта работы – распрацоўка методыкі вызначэння месцазнаходжання і характарысатык прамысловых кластэраў (групаў) для яе выкарыстання ў працэсе распрацоўкі арганізацыйна-эканамічных механізмаў павышэння канкурэнтаздольнасці прамысловасці Беларусі і Польшчы.

У працэсе даследавання была распрацавана і выкарыстана методыка вызначэння месцазнаходжання і характарысатык прамысловых кластэраў, якая ўключае неабходны матэматычны апарат, рэкамендацыі па зборы даных і разліках, анкету для вызначэння характарысатык кластэраў і алгарытм яе апрацоўкі.

Навуковая значнасць вынікаў складаецца ва ўдасканаленні ведаў аб сувязях мікраўзроўню, якія ляжаць у аснове развіцця канкурэнтных перавагаў, у правядзенні міжнароднага параўнальнага аналізу і выяўленні рэзерваў росту канкурэнтаздольнасці прамысловых прадпрыемстваў.

Практычная і эканамічная значнасць вынікаў навукова-даследчай работы заключаюцца ў тым, што распрацаваная методыка, вынікі яе апрабацыі і выпрацаваныя рэкамендацыі павысяць якасць кіраўніцкіх рашэнняў у вобласці прамысловай і навукова-тэхнічнай і рэгіянальнай палітыкі Беларусі, у распрацоўцы арганізацыйна-эканамічнага механізму павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальных прадпрыемстваў.

АБАЗНАЧЭННІ І СКАРАЧЭННІ

АКЭД – Агульнагаліновая класіфікацыя эканамічнай дзейнасці

ВФ – венчурнае фінансаванне

ЕС – Еўрапейскі Саюз

ДР – даследаванні і распрацоўкі

ІСФЭ – індэкс структурна-фактарнай эфектыўнасці

КАП – кластэр-арыентаваная палітыка

ЛДЦПП – лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць

МП – малыя прадпрыемствы

ПСБ – прадпрыемствы на самастойным балансе

ХНП – хімічная і нафтахімічная прамысловасць

Lc – Localization Coefficient (каэфіцыент лакалізацыі)

Lq – Location Quotient (паказальнік размяшчэння)

OECD – Organisation of Economic Cooperation and Development (Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця)

PKD – Polska Klasyfikacja Dzialalnosci (Польская класіфікацыя эканамічнай дзейнасці)

SBICs – Small Business Investment Corporations (карпарацыі інвеставання малога бізнэсу)

US SIC – Unated States Standard Industrial Classification (Стандартная галіновая класіфікацыя ЗША)

World Bank – Сусветны Банк

Змест

Уводзіны 6
1 Базавыя канцэпцыі і тэарэтычныя асновы даследавання прамысловых кластэраў 9
1.1 Канцэпцыя кластэраў 9
1.2 Тэарэтычны фундамент галіновых кластэраў 18
1.2.1 Кластэры і размяшчэнне прамысловасці 18
1.2.2 Кластэры і інавацыі 21
1.3. Перавагі і абмежаванні функцыянавання галіновых кластэраў 29
2 Распрацоўка методыкі вызначэння месцазнаходжання і характарыстык прамысловых кластэраў у Беларусі і Польшчы 32
2.1 Лакалізацыйны аналіз 32
2.2 Параўнальны аналіз і выбар аптымальнага метаду лакалізацыі кластэраў 43
2.3 Распрацоўка анкеты для вызначэння характарыстык кластэраў і ўтвараючых іх сувязяў 47
2.4 Методыка вызначэння месцазнаходжання і характарыстык прамысловых кластэраў 49
3 Выяўленне галіновых кластэраў у Беларусі і Польшчы 54
3.1 Галіновыя кластэры ў Польшчы 54
3.2 Выяўленне галіновых канцэнтрацыяў у Беларусі 58
3.3 Ацэнка існавання кластэрных характарыстык у лесапрамысловым комплексе Беларусі 70
4 Дзяржаўная палітыка і фінансаванне развіцця галіновых кластэраў 81
4.1 Сутнасць і віды кластэр-арыентаванай палітыкі 81
4.2 Венчурнае фінансаванне як крыніца развіцця галіновых кластэраў 82
5. Аналіз перспектываў далейшага развіцця і практычнага выкарыстання атрыманых рэзультатаў 100
5.1 Рэкамендацыі па ўдасканаленню прамысловай, навукова-тэхнічнай і рэгіянальнай палітыкі Беларусі 101
Заключэнне 107
Спіс выкарыстаных крыніцаў 109

Уводзіны

У апошняе дзесяцігоддзе ў свеце назіраецца значны рост зацікаўленасці ў лакальнай канцэнтрацыі і спецыялізацыі прамысловасці, прычым не толькі сярод эканамічных географаў, але і сярод эканамістаў і практыкаў [1; 2; 3]. Зацікаўленасць гэта звязана з інтэнсіфікацыяй працэсу глабалізацыі, які надае новае гучанне пытанню аб ролі месцазнаходжання ў глабальнай эканоміцы. Частка навукоўцаў сцвярджае, што глабалізацыя праз стварэнне рынку без межаў, павышэнне мабільнасці фінансаў, рост колькасці транснацыянальных кампаніяў і пераход да інфармацыйнай эканомікі, сігналізуе аб «смерці дыстанцыі», аб «дэлакалізацыі» сацыяльна–эканамічных адносінаў, ці, іншымі словамі, значэнне месцазнаходжання губляе сваю ролю ў эканамічнай дзейнасці [4].

Аднак іншая, магчыма, большая, частка навукоўцаў лічыць, што глабалізацыя больш узмацняе, чым памяншае значэнне месцазнаходжання, і хутчэй рэгіянальная эканоміка, чым нацыянальная, з'яўляецца ключавым цэнтрам стварэння дабрабыту і міжнароднага гандлю [2; 3; 5]. Як падкрэслівае М. Портэр,

> *«У глабальнай эканоміцы з яе хуткім транспартаваннем, высокай хуткасцю перадачы інфармацыі і даступнасцю рынкаў, можна было б чакаць памяншэння важнасці месцазнаходжання. Аднак верна адваротнае. Устойлівыя канкурэнцыйныя перавагі ў глабальнай эканоміцы часта моцна лакалізаваны і ўзнікаюць дзякуючы канцэнтрацыі высокаспецыялізаванай кваліфікацыі і ведаў, інстытутаў, канкурэнцыі, бізнес і дасведчаных спажыўцоў» [*3, с. 90*].*

У той жа час сама глабальная інтэграцыя ўзмацняе лакальную спецыялізацыю, паколькі зніжэнне выдаткаў транспартавання і гандлёвых бар'ераў дазваляе фірмам канцэнтравацца з мэтай выйгрышу ад вонкавай эканоміі на маштабе вытворчасці. Канцэнтрацыя фірмаў робіць магчымым узнікненне перавагаў ад розных формаў рынкавых і нярынкавых спадарожных эфектаў (*spillovers*), якія ў сваю чаргу садзейнічаюць росту лакальнай інавацыйнасці і прадукцыйнасці [6].

Найбольш уплывовым папулярызатарам важнасці лакальнай эканомікі з'яўляецца М. Портэр, чыё паняцце «прамысловы кластэр» (*industrial cluster*[1]) за кароткі час стала стандартнай канцэпцыяй у гэтай сферы даследаванняў [7]. Больш за тое, Портэр прадстаўляе ідэю кластэраў не толькі як аналітычную канцэпцыю, але і як вызначальны інструмент эканамічнай палітыкі. І гэты інструмент стаў модным як сярод акадэмічных колаў[2], так і міжнародных арганізацыяў (OECD, World Bank) сярод нацыянальных урадаў,

[1] У перакладзе з англійскай мовы «cluster» азначае 1) грона; 2) пучок, звязка; 3) група.
[2] Хоць значная частка даследчыкаў згодна з важнасцю канцэпцыі кластэраў, шэраг навукоўцаў не прымае яе ў інтэрпрэтацыі М.Портэра, некаторыя, як напрыклад М. Бест [8], Р. Марцін [4], крытыкуюць.

агенцыяў рэгіянальнага развіцця і лакальных уладаў развітых і стаўшых на шлях развіцця краінаў, якія атаесамляюць кластэры з «эканомікай, заснаванай на ведах» (*knowledge–based economy*) [9; 10; 11]. У краінах Еўропы, Азіі, Паўночнай і Лацінскай Амерыкі ўзніклі ініцыятывы па падтрымцы і стварэнню кластэраў, якія разглядаюцца як рухавікі нацыянальных інавацыйных сістэмаў і эканамічнага росту [11]. У ЗША М. Портэр узначальвае буйную праграму па ацэнцы развіцця кластэраў і інавацыйнасці з мэтай ідэнтыфікацыі «лепшых прыкладаў», якія могуць быць выкарыстаны каб «заахвоціць развіццё кластэраў у рэгіёнах краіны» [12].

Для Беларусі, перад якой на сучасным этапе стаіць праблема пераходу на інавацыйны шлях развіцця і замацавання ўстойлівага месца ў міжнародным падзеле працы, важным з'яўляецца вывучэнне навукова-практычных вынікаў іншых краінаў у сферы павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі, усё большай арыентацыі на веды і навучанне, што найбольш яскрава праяўляецца ў атачэнні галіновых кластэраў. Толькі па гэтай прычыне гэты сацыяльна-эканамічны феномен варты вывучэння.

Навуковая ідэя, пакладзеная ў аснову дадзенай навукова-даследчай работы, складаецца ў праверцы гіпотэзы аб тым, што ўстойлівыя канкурэнтныя перавагі прадпрыемстваў у эканоміцы, якая паступова глабалізуецца, як правіла прасторава лакалізаваныя і ўзнікаюць дзякуючы канцэнтрацыі спецыялізаванай кваліфікацыі і ведаў, відаў дзейнасці і ўстановаў, а таксама канкурэнтаў і патрабавальных спажыўцоў. У выніку ўздзеяння спецыфічных сацыяльна-эканамічных сувязяў і асяроддзя, якія фармуюцца ў асобных геаграфічных раёнах, узнікаюць канкурэнтныя групы прамысловых прадпрыемстваў (прамысловыя кластэры). Пацвердзіць навуковую ідэю праекту мяркуецца на аснове даследавання фактычных даных з дапамогай распрацаванай методыкі вызначэння месцазнаходжання і характарысатык прамысловых кластараў. Паглыбленне ведаў аб мікраэканамічных механізмах фармавання канкурэнтных перавагаў ва ўмовах пераходнай эканомікі, а таксама правядзенне параўнальнага аналізу эфектыўнасці функцыянавання выяўленых кластараў у Беларусі і Польшчы дазволіць удасканаліць меры прамысловай і навукова-тэхнічнай палітыкі, накіраваныя на рост канкурэнтаздольнасці вышэйназваных краінаў.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца прадпрыемствы лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай і хімічнай і нафтахімічнай галінаў прамысловасці Беларусі і іх тэрытарыяльныя канцэнтрацыі (кластэры).

Асноўная мэта работы – распрацоўка методыкі вызначэння месцазнаходжання і характарысатык прамысловых кластэраў (групаў) для яе выкарыстання ў працэсе распрацоўкі арганізацыйна-эканамічных механізмаў павышэння канкурэнтаздольнасці

прамысловасці Беларусі і Польшчы. Аўтары заключнай справаздачы вырашылі не абмяжоўвацца прывядзеннем толькі распрацаванай методыкі і апісання яе выкарыстання, а больш шырока разгледзець праблему, якая даследуецца, імкнучыся паказаць яе сувязь з пытаннямі эканамічнай палітыкі і перспектывамі развіцця беларускай эканомікі.

1 Базавыя канцэпцыі і тэарэтычныя асновы даследавання прамысловых кластэраў

1.1 Канцэпцыя кластэраў

Чаму эканоміку належыць разглядаць праз прызму кластэраў, а не праз больш традыцыйнае групаванне прадпрыемстваў у галіны, зянятыя вытворчасцю матэрыяльных дабротаў або паслугаў? На гэта пытанне Портэр і іншыя навукоўцы адказваюць, што кластэры лепш адпавядаюць самому характару канкурэнцыі і крыніцам дасягнення куркурэнцыйных перавагаў. Кластэры лепш, чым статыстычна вылучаныя галіны ахопліваюць важныя сувязі, узаемадапаўняльнасць паміж галінамі, працэс распаўсюджвання тэхналогій, навыкаў, інфармацыі, маркетынгу і ўсведамлення патрабаванняў заказчыкаў.

Згодна з вызначэннямі Портэра, кластэр – гэта «геаграфічнае згуртаванне ўзаемазвязаных кампаніяў, спецыялізаваных дастаўцаў, гандляроў паслугамі, фірмаў з роднасных галінаў і асацыяваных інстытуцыяў (напрыклад, універсітэтаў, установаў па стандартызацыі, гандлёвых аб'яднанняў) у асобнай сферы дзейнасці, якія канкуруюць і ў той жа час супрацоўнічаюць» [3, с. 205], або «згуртаванне геаграфічна блізкіх узаемазвязаных кампаніяў і спалучаных з імі інстытуцыяў, якія дзейнічаюць у вызначанай сферы і характарызуюцца агульнасцю і ўзаемадапаўняльнасцю дзейнасці» [3, с. 207].

Агульныя довады на карысць галіновых кластэраў, згодна з М.Портэрам, наступныя. Большасць удзельнікаў кластэру не канкуруюць паміж сабою непасрэдна, паколькі, як правіла, абслугоўваюць розныя сегменты галіны. Аднак у кластэрах існуе шмат агульных патрэбнасцяў і магчымасцяў, яны сутыкаюцца з агульнымі абмежаваннямі і перашкодамі на шляху росту прадукцыйнасці. Разгляд групы кампаніяў як кластэру дазваляе выявіць спрыяльныя магчымасці для каардынацыі дзеянняў і ўзаемных выгадаў у сферы агульных інтарэсаў без пагрозы канкурэнцыі або абмежавання інтэнсіўнасці саперніцтва. Кластэр узмацняе магчымасці вядзення канструктыўнага дыялогу паміж роднаснымі кампаніямі і іх пастаўшчыкамі, урадам і іншымі інстытутамі. Дзяржаўныя і прыватныя інвестыцыі, накіраваныя на паляпшэнне ўмоваў функцыянавання кластэру прыносіць карысць адразу вялікай колькасці фірмаў. Спецыялізаваныя фактары кластэру, асабліва тыя, што садзейнічаюць інавацыям і мадэрнізацыі (напрыклад, даследчы інстытут), не толькі садзейнічаюць дасягненню высокага ўзроўню прадукцыйнасці, але і патрабуюць меншых выдаткаў працы і аказваюцца менш даступнымі з іншых месцаў [3].

У адной з апошніх работ (2003 г.) Портэр дае наступнае азначэнне кластэру [13, с. 549]:

Мы азначаем кластэр як геаграфічна блізкую групу ўзаемазвязаных кампаніяў, пастаўшчыкоў, правайдэраў паслугаў і асацыяваных інстытутаў у вызначанай сферы дзейнасці, якія звязаны экстэрналіямі (вонкавымі эфектамі) рознага тыпу. Прыкладамі кластэраў з'яўляюцца фінансавыя паслугі ў Нью-Йорку (Уолл Стрыт), вытворчасць медаппаратуры ў Бостане, інфармацыйныя тэхналогіі ў Осціне (Тэхас) і Сіліконавай даліне.

Асобныя навукоўцы лічаць, што дастатковай прычынай вывучэння кластэраў з'яўляецца папулярнасць дадзенай канцэпцыі ў сферы рэгіянальнага планавання (з чым цяжка пагадзіцца), і што рэгіянальнае развіццё ў цэлым нельга зразумець без некаторых ведаў і практычнага аналізу галіновых кластэраў [14, ч. 2.1]. Даследчыкі заклапочаны пытаннем, ці не з'яўляюцца галіновыя кластэры своеасаблівым міфам, метафарай, так званым «старым віном у новай бутэльцы», называюць іх хаатычнай канцэпцыяй і паспяхова пазіцыянаваным брэндам [4]. Іншыя імкнуцца знайсці ў канцэпцыі кластэру штосьці новае, інавацыйнае [15; 16]. У выніку ўсё большая частка навукоўцаў схіляецца да атаясамлення тэрміну «кластэр» з мадэрнізаванай версіяй прапанаванага яшчэ А. Маршалам [17] паняцця «прамысловы раён» (industrial district) [18; 19]. З гэтага вынікае, што старое паняцце было ўзроджана на новы лад, больш блізкі для разумення бізнес-структураў і дзяржаўных чыноўнікаў [4].

Як бы там ні было, у апошняе дзесяцігоддзе XX стагоддзя галіновыя кластэры сталі асновай рэгіянальнага эканамічнага планавання многіх краінаў, і лічыцца, што кластэрны падыход будзе дамінаваць пры фармаванні стратэгій развіцця ў XXI стагоддзі, асабліва ў сферы высокіх тэхналогіяў. Нягледзячы на шырокае прызнанне канцэпцыя кластэраў патрабуе крытычнай ацэнкі.

Прыведзеныя вызначэнні дазваляюць зрабіць выснову, што ідэя кластэра мае два сэрцавінныя моманты. Першая фундаментальная рыса – **сувязі** (*links*), якія маюць суб'екты кластэру. Гэтыя звязкі могуць быць вертыкальныя (ланцужкі пакупнікоў і прадаўцоў) і гарызантальныя (камплементарныя прадукты і паслугі, выкарыстанне падобных выдаткаў, тэхналогіяў, інстытуцыяў). Акрамя таго, большасць гэтых звязкаў уключае сацыяльныя повязі, якія плённа ўплываюць на развіццё фірмаў. Другая вызначальная рыса кластэру – **геаграфічная блізкасць** (*geographic proximity*) узаемазвязаных кампаніяў і іншых удзельнікаў кластэру. Сумеснае месцазнаходжанне заахвочвае і ўзмацняе перавагі па стварэнню новай вартасці, заснаваныя на ўзаемадзеянні паміж фірмамі [20].

Згодна з Портэрам, кластэр з'яўляецца крыніцай развіцця лакальных канкурэнцыйных перавагаў (метафарычны ромб аўтара), якія фармуюцца трыма

асноўнымі спосабамі [3, с. 221–233]. Па–першае, праз павышэнне прадукцыйнасці ўваходзячых у кластэр фірмаў за кошт узаемадапаўняльнасці дзейнасці і доступу да спецыялізаваных фактараў вытворчасці, інфармацыі, інфраструктуры і г.д. Па–другое, праз рост здольнасці да інавацыяў. Па–трэцяе, праз стымулы для ўзнікнення ў межах кластэру новага бізнесу.

У працах навукоўцаў паняцце «кластэр» атрымлівае часам даволі розныя, неаднародныя па зместу, інтэрпрэтацыі. У табліцы 1 прыведзены шэраг азначэнняў паняцця «кластэр».

Табліца 1 – Некаторыя азначэнні канцэпцыі кластэру [4].

Аўтары	Азначэнне
Ван дэн Берг, Браун, ван Віндэн (2001)	Гэты папулярны тэрмін найбольш блізка звязаны да лакальнага ці рэгіянальнага вымярэння сеткаў… Большасць азначэнняў раздзяляюць разуменне кластэру як лакалізаваных сетак спецыялізаваных арганізацыяў, вытворчыя працэсы якіх цесна звязаны абменам тавараў, паслугаў і/або ведаў
Роланд, дэн Хертаг (1999)	Кластэры могуць быць ахарактарызаваны як сеткі вытворцаў моцна ўзаемазалежачых фірмаў (уключаючы спецыялізаваных пастаўшчыкоў), звязаных адзін з адным у ланцугом стварэння даданай вартасці
Энрайт (1996)	Рэгіянальны кластэр – гэта галіновы кластэр, у якім фірмы-ўдзельнікі знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці
Зіммі, Зеннет (1999)	Мы азначаем інавацыйны кластэр як вялікую колькасць узаемазвязаных кампаніяў прамысловасці ці сферы паслуг, якія маюць высокую ступень супрацоўніцтва, як правіла праз ланцуг забеспячэння (supply chain) і дзейнічаюць у аднолькавых рынкавых умовах
Сван, Прэвезер (1998)	Кластэр азначае вяікую групу фірмаў у звязаных галінах у вызначанай мясцовасці
Сван, Прэвезер (1996)	Кластэры намі азначаюцца як групы фірмаў некаторай галіны, якія базуюцца на адной геаграфічнай плошчы
Фезер (1998)	Эканамічныя кластэры – гэта не толькі звязаныя і падтрымліваючыя галіны і інстытуты, а хутчэй звязаныя і дапаможныя інстытуты, якія становяцца больш канкурэнтаздольнымі ў выніку іх ўзаемасувязяў
Розенфельд (1997)	Кластэр абазначае канцэнтрацыі фірмаў, якія ў выніку геаграфічнай блізкасці і ўзаемазалежнасці здольныя ствараць сінергічны эффект, хоць маштаб занятасці ў ім можа не быць рэзка выражаным або заўважным

У табліцы 2 прыведзены шэраг базавых паняццяў, звязаных або блізкіх па сэнсу да паняцця «кластэр».

Табліца 2 – Базавыя паняцці, звязаныя з канцэпцыяй кластэраў

Паняцце	Азначэнне
Сектар (галіна) **Sector (Industry)**	Група прадпрыемстваў, якія вырабляюць падобную прадукцыю (напрыклад, у адпаведнасці са Стандартнай галіновай класіфікацыяй ЗША (U.S. Standard Industrial Classification))
Галіновы кластэр **Industry cluster**	Група камерцыйных прадпрыемстваў і некамерцыйных арганізацыяў, для якіх удзел у групе з'яўляецца важным элементам індывідуальнай канкурэнтаздольнасці. Замацоўваючымі (binding) кластэр з'яўляюцца «сувязі пакупнік-пастаўшчык, агульныя тэхналогіі, агульныя пакупнікі ці каналы збыту, агульныя рэзервы працоўных рэсурсаў» [15, с. 191]
Рэгіянальны галіновы кластэр (**Regional industry cluster)**	Кластэр, элементы якога размяшчаюцца ў адным рэгіёне, пад якім разумеецца метраполія, рынак працы або іншая функцыянальная эканамічна-адміністратыўная адзінка
Патэнцыйны галіновы кластэр (**Potential industry cluster**)	Група ўзаемазвязаных і дапаўняючых прадпрыемстваў і інстытутаў, якія, пры ўмове з’яўлення дадатковых ключавых элементаў, міжфірмавых сувязяў або важных сумежных сектараў атрымаюць некаторыя вызначаныя характарыстыкі (крытычную вагу)
Галіновы кластэр тыпу «ланцуг вартасці» (**Value-chain industry cluster**)	Кластэр тыпу «ланцуг вартасці» - гэта галіновы кластэр, які складаецца з пашыранага ланцугу выдаткі-выпуск ці пакупнік-пастаўшчык. Ён уключае канцовых вытворцаў, а таксама пастаўшчыкоў першага, другога, трэцяга і г.д. шэрагк, які проста або ўскосна ўцягнуты ў гандаль. Такі кластэр складаецца з шматстадыйных сектараў ці галінаў [21, с. 62] і адпавядае азначэнню галіновага кластэру, якое ў 1979 г. далі С.Чаманскі и Л.Аблас: «падмноства галінаў эканомікі, якія звязаны струменямі тавараў і паслугаў мацней, чым з іншымі сектарамі нацыянальнай эканомікі» [22, с. 62].

Табліца 2

Паняцце	Азначэнне
Сетка бізнесу (**Business network**)	«Група фірмаў з абмежаваным удзелам і спецыфічнымі, часта заснаванымі на кантрактах, мэтамі бізнесу, якія прыводзяць да ўзаемнай фінансавай выгады. Удзельнікі сеткі выбіраюць адзін аднаго па шэрагу прычынаў; яны згодны адкрыта супрацоўнічаць некаторым спосабам і залежаць адзін ад аднаго ў некаторай ступені. Сеткі развіваюцца хутчэй унутры кластэраў, асабліва там, дзе шматкратныя трансакцыі вядуць да блізкага знаёмства і даверу» [23, с. 13]. Сувязі паміж фірмамі, якія ўваходзяць у сетку, як правіла больш фармальныя, чым у кластэры
Прамысловы раён італьянскага тыпу (**Italianate industrial district**)	Значна геаграфічна канцэнтраваная група кампаніяў, што «працуюць непасрэдна або ўскосна на адным рынку, падзяляюць каштоўнасці і веды, якія настолькі важныя, што вызначаюць культурнае асяроддзе, з'яўляюцца спецыфічна звязанымі адзін з адным у комплексным спалучэнні канкурэнцыі і кааперацыі» [24, с. 13]. Ключавой крыніцай канкурэнтаздольнасці з'яўляюцца элементы даверу, салідарнасці і супрацоўніцтва паміж фірмамі як вынік шчыльнага перапляцення эканамічных, сацыяльных і супольных адносінаў
Прамысловы комплекс (**Industry complex**)	«Група галінаў, злучаная важнымі струменямі тавараў і паслугаў, і ў дадатак дэманструе падобнасць мадэляў размяшчэння» [22, с. 62].
Інавацыйнае асяроддзе (**Innovative milieu**)	Не група бізнесу або рэгіёнаў, але «комплекс, здольны ініцыяваць сінергічны працэс..., комплексная сістэма, якая складаецца з эканамічных і тэхналагічных узаемазалежнасцяў..., звязанае цэлае, у якім злучаны тэрытарыяльная вытворчая сістэма, тэхнічная культура і галоўныя дзейсныя суб'екты» [25, с. 113]

Як бачым, прыведзеныя паняцці, звязаныя з канцэпцыяй кластэраў, з'яўляюцца вельмі неаднароднымі, хаця ў пэўным сэнсе даволі блізкімі тэрмінамі. Больш за тое вылучаецца шэраг разнавіднасцяў кластэраў. Напрыклад, Энрайт [15] вылучае шэраг падвідаў кластэраў, якія ўзнікаюць у тым ліку ў выніку прыватных ініцыятываў і дзяржаўнай падтрымкі (табліца 3).

Табліца 3 – Падвіды галіновых кластэраў [15]

Падвід кластэраў	Азначэнне
Арганічныя (organic)	Стратэгіі арганічных кластэраў накіраваны на пашырэнне і паглыбленне існай эканамічнай базы рэгіёну
Трансплантаваныя (transplant)	Трансплантаваныя кластэры пабудаваныя на аснове прыцягнення ўнутраных інвестыцый.
Шчыльныя (dense)	Шчыльныя кластэры ствараюцца сотнямі фірмаў з вельмі значным аб'ёмам агульных продажаў.
Рассеяныя (sparse)	Рассеяныя кластэры не маюць аднолькавай эканамічнай вагі, уключаюць няшмат фірмаў або мала значных прадпрыемстваў.
Шырокія (broad)	Шырокія кластэры занятыя выпускам шырокай наменклатуры прадукцыі ў блізка звязаных галінах.
Вузкія (narrow)	Вузкія кластэры складаюцца з адной або некалькіх галінаў і ланцугоў іх забеспячэння (supply chains).
Глыбокія (deep)	Глыбокія кластэры ўтрымліваюць поўныя або амаль поўныя ланцугі забеспячэння (supply chains).
Латэнтныя (latent)	Латэнтныя кластэры маюць крытычную масу кампаній у звязаных галінах, але яны не развілі ўзаемасувязяў і абмену інфармацыяй, неабходных для атрымання поўных перавагаў ад сумеснай лакалізацыі
Патэнцыйныя (potential)	Да патэнцыйных адносяцца кластэры, якія маюць некаторыя з неабходных для паспяховага развіцця элементаў, яле гэтыя элементы павінны быць паглыблены, каб атрымаць перавагі ад сумеснага месцазнаходжання
Індуцыраваныя палітыкай (policy-driven)	Індуцыраваныя палітыкай кластэры развіваюцца галоўным чынам у выніку дзяржаўнай палітыкі (напрыклад, праз прыцягненне прамых замежных інвестыцый).

Адзначаючы наяўнасць крытыкі канцэпцыі кластэраў, Бергман і Фезер, напрыклад лічаць, што «найбольшай каштоўнасцю канцэпцыі галіновых кластэраў з'яўляецца магчымасць дапамагчы як аналітыку, так і палісімейкеру «убачыць рэгіянальную эканоміку ў цэлым» [14, падраздзел 2.1]. На іх думку, «аналіз галіновых кластэраў (*industry cluster analysis*) хутчэй за ўсе не новы метад рэгіянальнай навукі, а ўсеабдымны падыход (*comprehensive approach*) да разумення рэгіянальных эканамічных умоваў і трэндаў, а

таксама выклікаў і магчымасцяў палітыкі, якія гэтыя ўмовы і трэнды прадказваюць». У значнай ступені гэты падыход і палітыка, якая на ім грунтуецца, можа разглядацца як выкарыстанне цэлага набору даўно вядомых, але рэстаўраванных тэорыяў, якія тлумачаць «як геаграфія садзейнічае эканамічнаму росту і зменам». На думку аўтараў, «аналіз галіновых кластэраў можа садзейнічаць выкарыстанню ўзросшага аб'ему эканамічных даных на ўзроўні рэгіена, з'яўляецца сродкам дзейснага асэнсавання галіновай узаемазалежнасці і дазваляе распрацаваць унікальную карціну рэгіянальнай эканомікі, якая дазваляе ўбачыць найбольш эфектыўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі» [14, падраздзел 2.1].

Іншыя даследчыкі адзначаюць, што «галіновыя кластэры існавалі заўсёды» [26, с. 7], але гістарычныя формы галіновых кластэраў, што ўключаюць сектары нацыянальнай прамысловасці з моцнымі вертыкальнымі і гарызантальнымі сувязмі паміж прадпрыемствамі, перажываюць змены. У прыватнасці, у ЗША распрацоўка канцэпцыі "моцных кластэраў" (*power clusters*) [27, 28] факусуецца на даследаванні крытычных вагаў кластэраў або сканцэнтраваных галін, якія граюць найбольшую ролю ў развіцці новых экспартных сектараў. Такім чынам, галіны, што складаюць ядро кластэра, абслуговываюць у асноўным рынак па-за рэгіёнам лакалізацыі і з'яўляюцца экспартаарыентаванымі. Тым не менш, аўтары адзначаюць, што існуюць розныя тыпы кластэраў, якія ўключаюць традыцыйныя (дамінуючая галіна або група звязаных галінаў у рэгіене), але не тоесныя ім поўнасцю галіновыя кластэры, а таксама кластэры паслуг (*service-based clusters*), якія хутка развіваюцца. Прымаецца наступнае вызначэнне кластэра, якое выкарыстоўваецца ў справаздачы для Дэпартаменту камерцыі (Department of Commerce) ЗША:

> *«Галіновыя кластэры — гэта канцэнтрацыі (agglomerations) канкуруючых і узаемадзейнічаючых галінаў рэгіена, звязаных гарызантальнымі і вертыкальнамі адносінамі, якія ўключаюць моцныя сувязі спажывец-вытворца і набор сумесна выкарыстоўваемых эканамічных інстытутаў. Паколькі яны ўзнікаюць вакол стрыжнявога экспартаарыентаванага прадпрыемства, галіновыя кластэры павялічваюць дабрабыт рэгіёна і садзейнічаюць эканамічнаму росту» [29, с. 3].*

Аднак М. Партэр першапачаткова не лічыў экспартаарыентаванасць неабходнай умовай, падкрэсліваў важнасць для фармавання кластэру наяўнасці патрабавальных мясцовых спажыўцоў выробленай прадукцыі.

Трэба адзначыць яшчэ шэраг момантаў. М. Бэст лічыць, што «узятыя разам працягласць і шчыльнасць межфірменных сетак плюс мноства пасярэдніцкіх агенцтваў рэгіёна складаюць прамысловы раён або, па вызначэнню Портэра, кластэр фірм (хоць

ромб Портэра не упамінае пасярэдніцкія структуры)» [8, с. 15]. Далей аўтар падкрэслівае, што «для Портэра канкурэнтаздольнасць тлумачыцца вонкавымі для фірмы фактарамі» (інтэнсіўнасць канкурэнцыі, існаванне ўзаемадапаўняльных сектараў, спецыфічнасці прамысловых фактараў і пільнасць спажыўцоў — гл. [3]). Такім чынам, Портэр, выкарыстоўваючы канцэпцыю кластэру, не вытлумачвае канкурэнтны поспех кластэра прадпрыемстваў ні ўнутранай дынамікай бізнесу, ні ўнутранай або вонкавай арганізацыйнай дынамікай. Не прапануецца і крытэру адрознення паспяховых і непаспяховых кластэраў, якія могуць надзвычай розніцца інстытутамі, формамі міжфірменнай канкурэнцыі і пасярэдніцкіх структураў [5, с.15]. Напрыклад, А. Саксеніан, параўнаўшы два вядомых кластэрных брэнды Сіліконавую даліну і Маршрут 128 (Route 128), знайшла дзве розныя сістэмы бізнесу [30]. Заснаваны на запатэнтаваным праграмным забеспячэнні, зачыненай сістэме і аўтакратычнай мадэлі фірмаў кластэр Маршрут 128 дрэнна ўзброены для канкурэнцыі са сканструяванай з модуляў, адчыненай і разгалінаванай групай вертыкальна спецыялізаваных фірмаў Сіліконавай даліны. У той жа час абодва кластэры не вельмі добра выглядаюць на фоне японскіх дыверсіфікаваных гігантаў бытавой электронікі. У адной са справаздач Рады канкурэнтаздольнасці ЗША за 1999 г., названым “Новыя выклікі для росквіту Амерыкі: высновы з індэксу інавацыйнасці”, Портэр прыводзіць прыклад з відэамагнітафонам, які распрацавала амерыканская кампанія Ampex, але камерцыялізавалі японскія фірмы [12, с.16].

Некаторая туманнасць портэраўскай канцэпцыі кластэраў дае яму магчымасць яе гнуткага трансфармавання ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі і апраўдання няспраўджаных чаканняў ад ініцыятываў кластэр-арыентаванай палітыкі. Напрыклад, у 2003 г. Дэпартамент гандлю і прамысловасці (DTI) Вялікабрытаніі запрасіў прафесара Портэра даследаваць цяперашні стан канкурэнтаздольнасці краіны і прычыны адставання прадукцыйнасці краіны ад асноўных канкурэнтаў. У фінальнай справаздачы ў раздзеле, прысвечаным развіццю кластэраў, М. Портэр з суаўтарам вызначылі, што намаганні DTI у кірунку выяўлення кластэраў ў Англіі «**пацярпелі** (выдзелена мною – У.В.) ад вольных азначэнняў кластэраў». Далей яны адзначаюць, што праведзены «аналіз не змог зрабіць галоўнага адрознення паміж мясцовымі (local) і «гандлюючымі» (traded) сектарамі», якія ў ЗША, напрыклад, «…больш сканцэнтраваны геаграфічна і абслугоўваюць рынкі, якія знаходзяцца па-за іх межамі. Яны налічваюць толькі трэцюю частку занятых, але маюць нашмат большую прадукцыйнасць, інавацыйнасць і заработную плату» [12, с.29]. Можна бачыць, што гэта крытэр вылучэння кластэру, якога Портэр прытрымлівацца ў апошні час [31], мае адрозненні ад яго папярэдніх азначэнняў. Такім чынам, Портэр фактычна сам прывеў прыклад, калі ў многім з-за тэарэтычнай

неадназначнасці яго канцэпцыі аказаліся малаэфектыўнымі намаганні дзяржаўнай палітыкі асобнай краіны.

У прадмове да справаздачы [32] кіраўнікі Дэпартамента гандлю і прамысловасці і Цэнтру сацыяльна-эканамічных даследаванняў Вялікабрытаніі адзначаюць, што найбольш каштоўны вынік даследавання ў тым, што «такія інструменты прамысловай палітыкі як дэрэгуляцыя, прыватызацыя і канкурэнцыя зараз маюць меншую аддачу», і «прафесар Портэр лічыць, што Аб'яднанаму Каралеўству зараз патрэбен пыдыход, заснаваны на паляпшенні кваліфікацыі, стымуляванні інавацый і садзейнічанні развіццю прадпрыемстваў», і «ў дапаўненне да рэкамендацый па правядзенню палітыкі, прафесар Портэр выклаў грандыёзную праграму даследаванняў для Аб'яднанага Каралеўства» [32, с. 1]. У заключэнні Портэр паказвае, што Вялікабрытаніі неабходны новыя, больш поўныя статыстычныя даныя па кластэрах на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, і « для падтрымкі новай эканомікі могуць спатрэбіцца новыя патрабаванні да даных па прадпрыемствах» [32, с. 47].

Можна заўважыць, што «грандыёзныя праграмы даследаванняў» – гэта новы віток попыту на працу спецыялістаў-экспертаў, у якой апошнія не могуць не быць зацікаўлены.

Неабходна адзначыць, што Портэр, безумоўна, станоўча паўплываў на тэорыю і практыку эканомікі ўвёўшы ў эканамічны аналіз такія паняцці як «канкурэнтная стратэгія», «ланцуг каштоўнасці», «кластэр». Аднак існуюць разыходжанні паміж яго думкамі аб контрпрадукцыйнасці прамысловай палітыкі і актыўным уцягненнем у ініцыятывы прамысловай палітыкі па вызначэнню «лепшых прыкладаў» кластэраў і іх мэтанакіраванай «імплантацыі» ў іншых рэгіёнах. У канцэпцыі кластэраў у стыле Портэра рашэнне праблемы канкурэнтаздольнасці зводзіцца да стварэння вонкавых у адносінах да ўнутраных працэсаў на прадпрыемствах умоваў для развіцця кластэра з усімі яго атрыбутамі.

У той жа час выснова Портэра, зробленая на падставе даследаванняў канкурэнтаздольнасці, сведчыць, што «адзіная разумная канцэпцыя канкурэнтаздольнасці на нацыянальным узроўні — гэта прадукцыйнасць… Прадукцыйнасць залежыць ад якасці і ўласцівасцяў прадукцыі (што вызначае цэны, якія можна ўстанавіць), а таксама ад эфектыўнасці вытворчасці… Прадукцыйнасць, якая забяспечваецца людскімі рэсурсамі, вызначае заработную плату; прадукцыйнасць выкарыстання капіталу вызначае даходы, які атрымліваюць яго ўласнікі» [3, с. 168]. Гэтую думку Портэра нельга расцэньваць інакш, як прызнанне факта важнасці ўнутрыфірмавай эфектыўнасці выкарыстання фактараў вытворчасці.

Як трапна вызначыў М.Бэст «калі групы прадпрыемстваў не будуць развіваць спецыфічныя арганізацыйныя магчымасці для дасягнення ўсебаковай рэзультатыўнасці па крытэрах «танней, хутчэй, лепш, эластычней і навей», ніякі аналіз кластэраў не паўздзейнічае на эканамічную эфектыўнасць рэгіёна» [8, с.16].

Такім чынам, разгляд органамі дзяржаўнага кіравання эканомікі скрозь прызму канцэпцыі кластэраў можна лічыць крокам насустрач новым умовам канкурэнцыі ў сучасных умовах. Аднак гэта канцэпцыя не з'яўляецца панацэяй. Гаспадарчыя сувязі прадпрыемстваў і ўстаноў развіваюцца, калі яны прыносяць прыбытак. У пэўных эканамічных умовах прыбытак ад расшырэння ўзаемаадносінаў вытворчага і невытворчага характару можа адсутнічаць, або, хутчэй, эканамічныя выдаткі устанаўлення сувязяў могуць перавышаць эфект ад іх, прынамсі ў кароткатэрміновай перспектыве. Так або інакш, вызначальнымі з'яўляюцца сувязі, заснаваныя на логіцы вытворчасці і яе канкурэнтаздольнасці, а не на сляпым жаданні супрацоўніцтва або выпадковых абставінах. Не выпадкова, адзін з нямногіх кансенсусаў, да якога прыйшлі навукоўцы і практыкі, зацікаўленыя канцэпцыяй кластэраў, заключаецца ў тым, што «малаверагодна, што палітыка стварэння кластэру de novo будзе мець поспех. Хутчэй яна зможа будавацца на патэнцыяле, які ўжо прысутнічае ў пэўным месцы» [4, с. 38].

1.2 Тэарэтычны фундамент галіновых кластэраў

1.2.1 Кластэры і размяшчэнне прамысловасці

Вывучэннем размяшчэння эканамічнай актыўнасці займаецца асобны раздзел эканамічнай навукі – эканамічная геаграфія [33, с. 33]. Пол Кругман адзначае, што нягледзячы на спробы эканамічных географаў, у першую чаргу У. Ізарда, прасторавы аналіз амаль не прысутнічае ў мэйнстрыме сучаснай эканамічнай тэорыі. Тлумачэнне, што традыцыя прасторавай эканомікі зарадзілася ў Германіі (перадусім у працах фон Цюнена), і таму не здолела замацавацца ў англа-саксонскай школе, на думку Кругмана, з'яўляецца вельмі спрошчаным [33, с. 34]. Аўтар абгрунтавана паказвае, што сучасная эканоміка абстрагуецца ад прасторавых характарыстык эканамічнай актыўнасці ў выніку цяжкасці далучэння ў распаўсюджаныя эканамічныя мадэлі і мадэлявання праблемаў

структуры рынку (market structure) з улікам факту эфекту маштабу або павялічваючайся аддачы (increasing returns). Традыцыйныя эканамічныя мадэлі заснаваныя на прынцыпе Парэта-эфектыўнасці, прадказваюць раўнамернае размяшчэнне эканамічнай актыўнасці на абстрактнай раўніне без транспартных выдаткаў: у выніку, як піша Кругман «мы бачым нават не свет невялікіх вёсак, а толькі невялікія самадастатковыя фермы» [33, с. 36]. Натуральна, што такія мадэлі не могуць патлумачыць існаванне Сіліконавай даліны, дзе на плошчы 150 квадратных міляў працуе каля 2 млн. чалавек. У выніку прасторавыя аспекты ігнаруюцца сучаснымі тэарэтыкамі эканомікі. Тым не менш вывучэнне лакалізацыі эканамічнай дзейнасці працягвалася эканамічнай геаграфіяй у межах некалькіх асноўных традыцыяў, да якіх Пол Кругман адносіць нямецкую геаметрычную школу (Germanic Geometry), традыцыю сацыяльнай фізікі (social physics), традыцыю кумулятыўнай прычыннасці (cumulative causation), традыцыю лакальных вонкавых эфектаў (local external economics) і, нарэшце, традыцыю, якая вывучае зямельную рэнту і выкарыстанне зямлі (land rent and land use) [33, с. 38-55].

Неабходна спыніцца на некаторых фактарах лакалізацыі, якія надзвычай цяжка выразіць колькасна. Перш за усё гэта датычыць эфекту агламерацыі, які часам раздзяляюць на эканомію ад прасторавага суседства, ад лакалізацыі і урбанізацыі, і часта разглядаюць як вонкавыя эфекты. **Эканомія ад лакалізацыі узнікае**, напрыклад, калі некалькі падобных заводаў размяшчаюцца побач для таго каб: 1) атрымаць перавагі ад сумеснага набыцця большага аб’ёму фактараў вытворчасці (большых партыяў), што дазваляе атрымаць рэсурсы па больш нізкіх цэнах, чым пры набыцці асобнымі меншымі партыямі; 2) зберагчы сродкі, карыстаючыся паслугамі агульнага рамонтнага аб’екту ці іншай магутнасці, калі кожны з заводаў выкарыстоўвае гэтыя паслугі нерэгулярна і немэтазгодна мець такія магутнасці ва уласнасці; 3) прэзентаваць разнастайныя бакі сваёй прадукцыі шляхам сумеснай дэманстрацыі яе з іншымі заводамі, што прыцягвае спажыўцоў, якім важна параўноўваць дызайн, або якія проста атрымліваюць задавальненне ад параўнаўчага шопінгу (*comparison shopping*); 4) панізіць выдаткі або павялічыць продажы шэрагам іншых спосабаў.

Эканомія ад урбанізацыі, рэалізаваная заводам або фірмай, праяўляецца як пазітыўны вонкавы эфект, які залежыць ад памеру і эканамічнай актыўнасці гораду ці метраполіі, або іншага кластэру дыверсіфікаваных фірмаў, у межах якога знаходзіцца прадпрыемства. Гэтая эканомія узнікае, у прыватнасці, дзякуючы: 1) даступнасці большага і болей разнастайнага выбару транспартных і экспедыцыйных паслуг; 2) наяўнасці больш шырокага спектру кансультацыяў, аналітыкі, бібліятэк і іншых інфармацыйных базаў дадзеных; 3) магчымасці непасрэднага доступу да вялікіх і

спецыялізаваных аб’яднанняў кваліфікаванай працоўнай сілы і высокакласных менеджэраў; 4) існавання больш разнастайнай і прыцягальнай інфраструктуры адпачынку і культурных установаў, як дадатковага элементу, які дапамагае заводам забяспечваць сябе прадукцыйнай працоўнай сілай і зберагаць яе; 5) развіццю перадавой і удасканаленай інфраструктуры. Гэтыя эфекты, як правіла, даступныя кожнаму прадпрыемству, наяўнасць падабенства іх дзейнасці неабавязковая.

Нягледзячы на тое, што наяўнасць агламерацыйных эфектаў можа быць вырашальнай для размяшчэння вытворчасці, іх вымярэнне з'яўляецца вельмі цяжкай задачай. Неабходна дадаць, што эканомія ад лакалізацыі і урбанізацыі надзвычай важныя для слабаразвітых рэгіёнаў, якія могуць прапанаваць часта толькі адну спецыфічную перавагу для лакалізацыі, скажам танную працу або недарагія энергарэсурсы. Для фірмаў, якія могуць тут размясціцца для выкарыстання гэтай перавагі, важна атрымаць набор істотных (дапаўняльных) відаў дзейнасці, уключаючы інфраструктурныя паслугі. Апошнія могуць быць прадстаўлены па прыймальных коштах толькі пры наяўнасці агламерацыйных эфектаў, для з'яўлення якіх рэгіёну неабходна дасягнуць некаторай крытычнай масы, эфекту маштабу.

Не менш цяжка колькасна ацаніць пры ацэнцы параўнальных выдаткаў такі фактар як прыродныя умовы і прыродаахоўнае рэгуляванне. Для рэгіянальных уладаў узнікае неабходнасць аптымальнага сумяшчэння мета. Нізкія патрабаванні да шкодных выкідаў могуць спрыяць прыцягненню новых вытворчасцяў, але адначасова рост забруджвання будзе пагаршаць умовы пражывання, выклікаць рост захворванняў, скарачаць экстэрнальныя эфекты, што ў выніку прывядзе рэгіён на шлях да заняпаду.

У сувязі з важнасцю для рэгіёну пераходных краінаў развіцця галінаў абслугоўвання (*service trades*) з улікам яе ролі ў развіцці агламерацыйных эфектаў неабходна спыніцца на прынцыпах іх лакалізацыі. Па сутнасці, для сферы абслугоўвання прымяняюцца такія ж прынцыпы лакалізацыі, як і для галінаў прамысловасці — прынцыпы, якія базуюцца на: 1) доступе да фактараў вытворчасці (сыравіна, прамежкавыя тавары, праца, капітал, паслугі і г.д.); 2) доступе да рынкаў збыту; 3) маштабе вытворчасці прадпрыемстваў і агламерацыйных эфектах. Аднак, як правіла, доступ да сыравіны для сферы абслугоўвання не мае ключавога значэння, доступ да рынку больш важны, чым для прамысловых фірмаў, а эфекты маштабу, лакалізацыі і урбанізацыі з'яўляюцца асноўнымі, калі не вызначальнымі. Паколькі доступ да рынку з'яўляецца ключавым фактарам, то становіцца важным адрозніваць асноўныя характарыстыкі рынкаў, асабліва іх прасторавы аспект.

У прынцыпе кластэры галінаў абслугоўвання фармуюцца па тых жа самых прычынах, што і кластэры прамысловых фірмаў. Аднак прырода эканамічных фактараў даволі розная. Для галінаў абслугоўвання адносіны твар-да-твару (face-to-face) і падобныя тыпы узаемаадносінаў з'яўляюцца нашмат больш важнымі. Гэта можа тлумачыцца тым, што паслугі прадугледжваюць трансакцыю, якая не мае добра вызначанага стандарту, не з'яўляецца уніфікаванай. Як правіла некаторыя аспекты працэсу транзакцыі, часамі даволі непрыемныя, патрабуюць распрацоўкі дэталяў, што можа зроблена пры перагаворах ключавых фігураў. Або трансакцыя (ці кантракт) можа быць настолькі складанай, што запатрабуе серыю канферэнцыяў для абмену поглядамі па праблеме. Або дакладнасць аказання паслугі можа быць няпэўнай з-за умоваў надвор'я, наяўнасці ў вызначаны час прафесійных аператараў, флуктуацыяў абменных курсаў, працэнтных ставак ці фондавага рынку і г.д. У такіх выпадках патрабуецца магчымасць арганізаваць імгненную сустрэчу дагаворных бакоў для перазаключэння ці удакладнення кантракту.

Аказанне такіх паслуг патрабуе хуткіх непасрэдных узаемаадносінаў партнёраў — магчымасці сустрэцца, правесці перамовы, паўтарыць перамовы, растлумачыць нечаканыя праблемы. Як вынік, кошты геаграфічнай адлегласці паміж ключавымі бакамі трансакцыі значна узрастаюць, калі існуюць нестандартныя, складаныя, нявызначаныя працэдуры трансакцыяў, якія патрабуюць тлумачэння, інтэрпрэтавання, вывучэння і іншай дзейнасці кагнітыўнага тыпу. Менавіта таму шматлікія галіны абслугоўвання маюць тэндэнцыю да групавання ў кластэры каб пазбегнуць выдаткаў геаграфічнай дыстанцыі, што вельмі актуальна нягледзячы нават на значнае скарачэнне выдаткаў на перадачу інфармацыі (інтэрнет) і выдаткаў дастаўкі паслугаў.

Такім чынам, можна заключыць, што дыферэнцыяцыя выдаткаў лакалізацыі галінаў абслугоўвання прыводзіць да наступных формаў размяшчэння: 1) у некаторых выпадках лакалізацыя галіны абслугоўвання можа адбывацца ў ізаляваных слабаразвітых рэгіёнах (скажам, пры наяўнасці таннай працоўнай сілы здольнай забяспечыць высокастандартызаванае абслугоўванне рынкаў рознага памеру і канфігурацыяў); 2) у іншых выпадках адбываецца фармаванне малых або сярэдніх або буйных кластэраў розных відаў паслуг, якія маюць разнастайныя узаемасувязі; 3) у адносна нешматлікіх выпадках узнікаюць гіганцкія канцэнтрацыі шчыльна узаемазвязаных і спецыялізаваных відаў паслуг, такіх як глабальныя фінансавыя цэнтры.

1.2.2 Кластэры і інавацыі

Згодна з высновамі Савету па канкурэнтаздольнасці ЗША, можна вылучыць тры галоўныя складовыя агульнай інавацыйнай рэзультатыўнасці краіны [12, с. 5]: **агульная**

інавацыйная інфраструктура (напрыклад, інвестыцыі ў фундаментальную навуку), **спецыфічныя кластэрныя ўмовы**, якія садзейнічаюць развіццю інавацыяў у межах звязаных прадпрыемстваў аднаго або некалькіх роднасных сектараў, і, нарэшце, сіла **ўзаемасувязяў** паміж пералічанымі элементамі — сувязь фундаментальных даследаванняў і вытворчасці, а таксама пераліў ведаў і дасягненняў з прадпрыемстваў у эканоміку (малюнак 1).

Калі фундаментальныя даследаванні і эфект пераліву (*spillover effect*) вынікаў даследаванняў і распрацовак лічацца традыцыйнымі фактарамі развіцця інавацыяў, то роля кластэрных умоваў патрабуе тлумачэння.



Малюнак 1 – Элементы нацыянальнай інавацыйнасці [12, с. 15]

Чаму важна ўзаемадзеянне паміж фундаментальнымі ведамі і кластэрамі прадпрыемстваў? Гісторыя сучаснай эканомікі багатая на прыклады, калі навуковыя вынаходствы былі зробленыя ў адных краінах, а камерцыйна рэалізаваны ў іншых. Напрыклад, моцная хімічная прамысловасць Германіі XIX ст. значна залежала ад адкрыццяў брытанскіх хімікаў. Вынаходніцтва відэамагнітафону амерыканскай кампаніяў Ampex у 1956 г. пераўтварылі ў буйны камерцыйны поспех менавіта японскія кампаніі. Гісторыя таксама дае шматлікія прыклады, калі нацыянальная прамысловасць развівала і захоўвала інавацыі і міжнародныя канкурэнтныя перавагі дзесяцігоддзямі, як, напрыклад, амерыканская кампутарная і нямецкая аўтамабільная прамысловасць. У кожным з гэтых выпадкаў інавацыйны і канкурэнтны поспех падтрымліваўся шырокім колам спрыяльных абставінаў. Напрыклад, поспех нямецкай хімічнай прамысловасці ў значнай ступені

падтрымліваўся высокаразвітай універсітэцкай сістэмай, якая заахвочвала даследчыцкае партнёрства з галіною [12, с. 16].

Апісаныя выпадкі тлумачаць вылучэнне двух буйных элементаў нацыянальнай інавацыйнасці: *агульнага* набору інстытутаў (інфраструктуры) і укладваемых у развіццё інавацыяў сродкаў (інвестыцыі ў фундаментальныя даследаванні, адукацыю, у развіццё ўзаемасувязяў паміж універсітэтамі і падрыхтоўку навукоўцаў і інжынераў), а таксама *спецыфічных* магчымасцяў групаў узаемазвязаных галінаў (галіновых кластэраў). Нацыянальная інавацыйная рэзультатыўнасць, такім чынам, з'яўляецца вынікам узаемадзеяння агульнай інавацыйнай інфраструктуры і спецыфічных абставінаў і магчымасцяў асобных сектараў эканомікі.

Важна разглядаць менавіта кластэры (напрыклад, інфармацыйныя тэхналогіі), а не асобныя галіны (вытворчасць прынтэраў), паколькі існуюць моцныя пералівы ведаў і вонкавыя эфекты (*externalities*), якія спалучаюць канкурэнтаздольнасць і ступень інавацыйнасці кластэраў. Як паказана на малюнку 1, пералівы ведаў маюць месца і паміж кластэрамі. Напрыклад, інавацыі ў аўтамабільнай прамысловасці падцягваюць інавацыі ў кластэрах інфармацыйных тэхналогіяў і нетрадыцыйных матэрыялаў. У сувязі з важнаю роляй геаграфічнай блізкасці ў межах краіны не выключаецца існаванне некалькіх рэгіянальных кластэраў у адной галіне.

Развіццё інавацыяў патрабуе шмат больш, чым навука і тэхналогіі. Важная наяўнасць высокаякасных і спецыялізаваных фактараў вытворчасці, у прыватнасці, чалавечага капіталу і эфектыўнай сістэмы інфармавання пра «лепшыя прыклады» (*best practices*) і трансферу ведаў. Вызначальнымі з'яўляюцца таксама ўмовы для інвестыцыйнай дзейнасці і мясцовай канкурэнцыі, пастаянны ціск новых патрэбаў ад дасведчаных мясцовага попыту. Важна падкрэсліць, што нават пры існаванні усіх азначаных спрыяльных умоваў для інавацыяў, апошнія горш развіваюцца, калі фірмы ізаляваныя або калі інавацыйныя здольнасці да інавацыяў адсутнічаюць у фірмаў-партнёраў з блізкіх сектараў. Прысутнасць кластэру роднасных галінаў часта дазваляе больш якасна і хутка задавальняць новыя патрэбы спажыўцоў, чым гэта могуць зрабіць ізаляваныя кампаніі. Напрыклад, кампутарныя кампаніі, якія базуюцца ў Сіліконавай даліне і Аусціне, маюць магчымасць увайсці ў патрэбы спажыўцоў так хутка і эфектыўна, як гэта не магчыма ні ў якім іншым месцы [12, с. 19]. Адпаведна фірмы, якія размешчаныя ў межах гэтых кластэраў, маюць магчымасць камерцыялізаваць свае інавацыі дзякуючы даступнасці сканцэнтраваных у кластэры неабходных кампанентаў, абсталявання і паслугаў. Прычым большасць перавагаў, якія дае асяроддзе кластэру, у большай ступені спрыяльныя для развіцця малога прадпрымальніцтва.

Больш ста гадоў таму Альфрэд Маршал пісаў [17, т. 1, с. 352]:

Калі якая-небудзь вытворчасць выбрала для сябе месцазнаходжанне, то верагодней усяго, што яна будзе заставацца там доўга, паколькі вельмі вялікімі з'яўляюцца выгады, атрымліваемыя людзьмі, якія належаць да адной прафесіі, з блізкага суседства (падкрэслена мной – У.В.) *адзін з другім. Таямніцы прафесіі перастаюць быць таямніцамі, але як бы пранізваюць усю атмасферу, дзеці несвядома пазнаюць многія з іх. Добрая праца ацэньваецца па справядлівасці, перавагі вынаходніцтваў у машынах і абсталяванні, у тэхналагічных працэсах і агульнай арганізацыі вытворчасці адразу ж падвяргаюцца абмеркаванню: калі хтосьці прапанаваў новую ідэю, яе падхопліваюць іншыя і дапаўняюць уласнымі меркаваннямі, і яна, такім чынам, становіцца крыніцай, якая нараджае новыя ідэі. У хуткім часе ў акрузе ўзнікаюць дапаможныя вытворчасці, якія забяспечваюць асноўныя інструментамі і матэрыяламі, арганізоўваюць для іх сродкі зносінаў і разнастайнымі спосабамі садзейнічаюць эканоміі спажываемай сыравіны.*

Фактычна ў прыведзенай цытаце выражаныя асноўныя ідэі важнасці геаграфічнага суседства для развіцця інавацый, узнікнення эканоміі ад узаемадапаўняльнасці дзейнасці і наяўнасці іншых лакалізацыйных эфектаў. Сумеснае месцазнаходжанне ў кластэрах падштурхоўвае і ўзмацняе ўзаемадзеянне прадпрыемстваў і арганізацый, садзейнічае ўзнікненню канкурэнтных перавагаў перш за ўсё ў выніку існавання спрыяльная асяроддзя для перадачы ведаў і навучання [14].

У сваіх апошніх працах Портэр стаў часцей акцэнтаваць важнасць перадачы ідэяў: «блізкасць (геаграфічная — У.В.) павінна быць дастатковай, каб садзейнічаць эфектыўнаму ўзаемадзеянню і струменям тавараў, паслуг, ідэяў і досведу ў межах кластэру» [32, с. 27]. Аўтар падкрэслівае важнасць разнастайных інстытутаў, якія «дапамагаюць рассейванню ведаў і забяспечваюць урадлівую глебу для новых ідэяў» і прыводзіць прыклад Бостанскага медыцынскага кластэру, дзе за перыяд 1996-2000 гг. было створана больш патэнтаў, чым у любым іншым рэгіёне ЗША [32].

У сучасных умовах глабалізацыі[1] працэс перадачы ведаў атрымлівае новыя рысы. Як адзначаюць даследчыкі, ва ўмовах развітой капіталістычнай гаспадаркі галоўнай формай арганізацыі прамысловасці стаў **фардызм**, які Цікел і Пек (A.Tickell, J.A.Peck, 1992)

[1] Пра супярэчнасць гэтага працэсу папярэджваў яшчэ А. Маршал: «Кожнае паніжэнне цэнаў на сродкі зносінаў, кожная новая магчымасць для свабоднага абмену ідэямі паміж аддаленымі мясцовасцямі змяняе дзеянні сілаў, якія вызначаюць лакалізацыю вытворчасці. Належыць адзначыць, што паніжэнне пошлінаў або фрахтаў за транспартыроўку тавараў прыводзіць да таго, што кожная мясцовасць набывае больш патрэбных ёй прадметаў у аддаленых ад яе раёнах, але, з другога боку, усё, што ўзмацняе гатоўнасць людзяў перасяляцца з аднаго месца ў іншае, пабуджае кваліфікаваных майстраў займацца сваім рамёствам паблізу ад спажыўцоў, якія будуць набываць іх вырабы. Гэтыя дзве супярэчлівыя тэндэнцыі яскрава прадэманстравала навейшая гісторыя англійскага народа» [17, т. 1, с. 355].

вызначаюць як «сістэму, што грунтуецца на масавай вытворчасці стандартызаваных дабротаў, спалучаецца з сістэматычна растучым рынкам масавага спажыўца і рэгулюецца праз кейнсіянскі тып макраэканамічнага кіравання». У 70-х гг. XX ст. у такой сістэм выявіліся шэраг крызісных з'яваў (выкліканых у тым ліку нафтавым крызісам 1973-74 гг.), пасля чаго пачалося развіццё новых формаў арганізацыі вытворчасці.

На першы план пачала выходзіць **неафардысцкая мадэль** развіцця, заснаваная на прынцыпах канкурэнтных перавагаў, якія ўзнікалі ў выніку паніжэння выдаткаў вытворчасці, дзякуючы як развіццю транспартных і камунікацыйных тэхналогій, так і лібералізацыі і дэрэгуляцыі міжнароднага гандлю і фінансавых рынкаў. На сучасным этапе на думку навукоўцаў эканоміку развітых краін лепшым чынам апісвае **постфардысцкая мадэль** развіцця «эканомікі, якая навучаецца», калі глабальная канкурэнцыя базуецца на дынамічных канкурэнтных перавагах, што ўзнікаюць дзякуючы больш прадуктыўнаму выкарыстанню рэсурсаў на аснове бесперапынных інавацыяў, выкарыстання ўнікальных камбінацыяў рэсурсаў.

Галоўная рыса **постфардызму** заключаецца ў эластычнасці адаптацыі да зменаў у попыце, якая адрозніваецца сярод іншага «добра развітай здольнасцю да хуткага пераходу ад аднаго спосабу вырабу або асартыменту да іншых, а таксама маланкавага скарачэння вытворчасці без значных наступстваў для ўзроўню эфектыўнасці». Згодна з Рубекам [34], рысамі постфардызму з'яўляюцца таксама: дэрэгуляцыя, палярызацыя і сегментацыя.

Постфардысцкую мадэль эластычнай вытворчасці вызначаюць тры асноўныя элементы: 1) эластычная тэхналогія; 2) эластычная арганізацыя вытворчасці; 3) эластычная праца.

Крытэрам адаптацыі выступае мінімізацыя так званых выдаткаў трансакцыі, што адбываецца праз стратэгію інтэрналізацыі або экстэрналізацыі. Маецца на ўвазе, што прымаюцца рашэнні – якія віды дзейнасці застаюцца ў межах прадпрыемства, а якія пачынаюць выконвацца звонку ў форме трансакцыі з іншымі прадпрыемствамі. Такім чынам, вынікаючая з частых зменаў попыту нявызначанасць спрыяе працэсу вертыкальнай дэзінтэграцыі вытворчасці, што радыкальна павялічвае агульную эластычнасць сістэм вытворчасці дзякуючы разнастайнасці трансакцыйных магчымасцяў. Сучасныя фірмы усё ў большай ступені выкарыстоўваюць стратэгію **экстэрналізацыі** (***outsourcing***). На практыцы гэта азначае выдзяленне з фірмы асобных відаў дзейнасці, прычым не толькі дапаможных, але і асноўных элементаў ланцуга вытворчасці. Істотнай рысай такіх трансакцыяў з'яўляецца патрэба ў дакладнай часовай каардынацыі вытворчасці, якая найлепшае адлюстраванне знаходзіць у сістэм *just-in-time*. У

постфордаўскай мадэлі вытворчасці **выгады маштабу вытворчасці** (***economy of scale***), якія граюць важную ролю ў фардызме і традыцыйных тэорыях лакалізацыі, страчваюць значэнне на карысць **выгадаў ад разнастайнасці** (***economy of scope***). Гэта ў сваю чаргу прыводзіць да узнікнення прамысловых агламерацыяў новага тыпу (з вялікай колькасцю малых і сярэдніх прадпрыемстваў, якія супрацоўнічаюць паміж сабою).

Неразвітасць рынкавых адносінаў у постсацыялістычных краінах, недахоп капіталу, невысокая карпарацыйная культура абумоўліваюць нерэальнасць пераходу адразу да постфардызму. Працяг існавання мадэлі фардызму ў сучасных пераходных умовах абумоўлівае існая структура гаспадаркі і велічыня незадаволеных спажывецкіх патрэбаў. Аднак трэба усведамляць, што менавіта за постфардызмам — агульны цывілізацыйны прагрэс, адкрыццё нацыянальнай гаспадаркі і прагрэсіўная дыверсіфікацыя грамадства.

Асаблівасці сучаснай эканомікі, дзе інавацыі і веды граюць усё больш значную ролю імкнуцца адлюстраваць канцэпцыі **эканомікі, якая навучаецца** (learning economy) і **эканомікі, заснаванай на ведах** (knowledge-based economy). Дадзеныя канцэпцыі адрозніваюцца, хоць і маюць шмат агульнага. Напрыклад, як першая, так і другая сцвярджае, што ў сучаснай глабалізаванай эканоміцы веды з’яўляюцца галоўным стратэгічным рэсурсам, а навучанне – фундаментальнай дзейнасцю для падтрымання канкурэнтаздольнасці. Аднак навукоўцы (сярод іх Б. Люндвал) больш шырока выкарыстоўваюць паняцце эканоміка, якая навучаецца, тады як у практычным выкарыстанні эканамісты OECD (Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, у якую уваходзяць 27 найбольш развітых краін свету) больш часта ўжываюць тэрмін «заснаваная на ведах» [35]. Асноўная розніца паміж паняццямі заключаецца ў прынятай у краінах OECD таксаноміі дзялення галінаў эканомікі на высока-, сярэдне- і нізкатэхналагічныя [36]. Да высокатэхналагічных адносяць галіны, у якіх расходы на даследаванні і распрацоўкі складаюць болей 5% тавараабароту (такому крытэру ў Беларусі адпавядаюць адзінкавыя прадпрыемствы).

У той жа час паняцце эканомікі, якая навучаецца заснавана на больш усеахватным разуменні інавацый, якія вызначаюцца як «трансфармацыя ведаў у новыя, ствараючыя багацце, тэхналогіі, прадукты і паслугі шляхам працэсу навучання і пошуку» [37].

Якімі б ні былі адрозненні паміж гэтымі канцэпцыямі, яны апісваюць якасныя змены ў развіцці рынкавай эканомікі. І гэтыя змены апісваюцца пераходам ад фардызму да постфардызму[1].

[1] Шмат навукоўцаў разам з Піорэ и Сэйблам (1984) лічаць такі пераход відавочным, і дыскутаваць, на іх думку, трэба толькі аб хуткасці, ступені інаступствах такога пераходу, у тым ліку палітычных і інстытуцыяльных. Аднак, належыць падкрэсліць, што гэты пераход адбываецца нераўнамерна і закранае не ўсе краіны [34, с. 113-114].

Постфардысцкае разуменне інавацыяў як «**інтэрактыўнага працэсу навучання**» [4, с. 39] менш «тэхнічнае». Інавацыйнымі могуць быць і традыцыйныя сектары, прадпрыемствы і нават цэлыя рэгіёны, а не толькі навукаёмістыя вытворчасці. Для падобнага «навучання» адкрытыя ўсе галіны эканомікі, г. зн., яны могуць быць інавацыйнымі ва ўказаным сэнсе, а традыцыйнае дзяленне на нізка- і высокатэхналагічныя сектары патрабуе перагляду.

У **постфардысцкім** разуменні індустрыялізацыя разглядаецца як тэрытарыяльны працэс, падкрэсліваецца важнасць лакалізацыйных, агламерацыйных і інстытуцыйных фактараў для распаўсюджвання ведаў. Галіновыя рэгіянальныя кластэры выступаюць эфектыўнай формай рэалізацыі інавацыяў, якія разумеюцца перш за ўсё як «інтэрактыўны працэс навучання» [20, с. 39]. Гэта азначае, што інавацыйнымі могуць быць і традыцыйныя сектары, прадпрыемствы і нават цэлыя рэгіёны, а не толькі навукаёмістыя вытворчасці. Для падобнага «навучання» адкрытыя ўсе галіны эканомікі, г. зн., яны могуць быць інавацыйнымі ва ўказаным сэнсе, а традыцыйнае дзяленне на нізка- і высокатэхналагічныя сектары з’яўляецца звужаным.

У паняцце інавацыі, або «ажыццяўленне новых камбінацыяў» укладваў шырокі сэнс яшчэ Й.А.Шумпетэр. Ён вылучаў наступныя пяць выпадкаў: «(1) Выраб новых... даброт... (2) Укараненне новага метаду (спосабу) вытворчасці... (3) Асваенне новага рынку збыту... (4) Атрыманне новай крыніцы сыравіны ці паўфабрыкатаў... (5) Правядзенне адпаведнай рэарганізацыі, напрыклад забеспячэнне манапольнага стану» [38, с. 159]. Як адзначаюць прадстаўнікі эвалюцыйнай эканомікі Р. Р. Нельсан і С. Дж. Уінтэр, прыведзены дыяпазон інавацыйнасці па Шумпетэру «выходзіць далёка за межы той цеснай прасторы навуковых і тэхнічных ведаў, на якой артадаксальная тэорыя размяшчае і тэхналагічныя змены, і патэнцыйныя магчымасці камерцыйных фірмаў» [39, с. 356].

Гэты пункт гледжання прымаецца і на ўзроўні развітых рынкавых краінаў. Так, у выданні Савету па канкурэнтаздольнасці ЗША адзін з распрацоўшчыкаў індэксу інавацыйнасці М. Портэр сцвярджае, што «інавацыі могуць павялічыць прадукцыйнасць ва ўсіх галінах. У гэтым сэнсе не існуе нізкатэхналагічных сектараў — існуюць нізкатэхналагічныя кампаніі, не здолеўшыя выкарыстаць новыя ідэі і метады ў сваіх прадуктах і працэсах. Інавацыйныя магчымасці прысутнічаюць сёння практычна ў любой галіне» [12, с. 12]. Інавацыі прыводзяць да росту прадукцыйнасці ўсіх сектараў эканомікі: аграрнага, тэкстыльнага, дрэваапрацоўчага і г. д. Калі ж галіну складаюць толькі нізкатэхналагічныя прадпрыемствы, то і галіну ў цэлым можна лічыць нізкатэхналагічнай. Іншымі словамі, у разгляд уключаюцца традыцыйныя, не ўцягнутыя ў працэс даследаванняў і распрацовак (non R&D-intensive) галіны, якія часта могуць складацца з

сярэдніх і малых прадпрыемстваў, што лакалізаваны ў перыферыйных рэгіёнах краіны – яскравы прыклад дрэваапрацоўчай прамысловасці Беларусі.

Такім чынам, можна пагадзіцца, што «інавацыі пачынаюцца з умоваў, якія дазваляюць асобным фірмам удасканаліць прадукцыю і вытворчыя працэсы» [2, с. 18]. На практыцы такі тып інавацыйнасці азначае паступовае ўдасканаленне да некаторага перадавога сусветнага ўзроўню ўсіх відаў дзейнасці прадпрыемстваў: ад арганізацыі вытворчасці і забеспячэння прадпрыемства да маркетынгу. Рэалізуюцца такія ўдасканаленні праз працэсы рэструктурызацыі – унутрыфірмавыя пераўтварэнні, імпульсам для якіх служаць стымулы і інфармацыя (веды), якія паступаюць з вонкавага асяроддзя прадпрыемства. Важнымі з'яўляюцца як тэхнічныя змены на прадпрыемствах, так і арганізацыйныя. Аднак у сувязі з глыбокім заняпадам тэхналагічнай базы галінаў эканомікі найбольш актуальнымі належыць лічыць змены ў тэхніка-тэхналагічным стане прадпрыемстваў.

Такім чынам, з праведзенага аналізу можна зрабіць папярэднія высновы. Па-першае, інавацыйная палітыка Беларусі павінна праводзіцца з улікам неабходнасці стварэння ўмоваў, арыетаваных на развіццё галіновых кластэраў і кластэрных сувязяў. Кластэры прадпрыемстваў характарызуюцца ўзмоцненым працэсам стварэння і перадачы ведаў, што дасягаецца дзякуючы:

а) разнастайным гарызантальным сувязям (з канкурэнтамі, якія вырабляюць сходную прадукцыю),

б) паніжэнню выдаткаў на каардынацыю распыленых ведаў і пераадолення асіметрыі інфармацыі,

в) аблягчэнню трансакцыяў, якія маюць месца ў вертыкальным вымярэнні кластэра (гандлёвыя сувязі).

Па-другое, інавацыйнасць належыць разумець больш шырока. Эканамічная і прамысловая палітыка краіны павінна быць скарэктавана ў напрамку актывізацыі працэсаў рэструктурызацыі прадпрыемстваў. У той жа час унутраная рэструктурызацыя сама па сабе не стварае гарантыі ўстойлівай эфектыўнасці ў доўгатэрміновай перспектыве. Паколькі прадпрыемствы «маюць карані», лакалізаваны ў канкрэтным месцы, іх канкурэнтаздольнасць у значнай ступені вызначаецца асяроддзем, інфраструктурай і інстытутамі перадачы ведаў на мясцовым узроўні. Неабходна палітыка, якая б спалучала стымулы да ўнутраных пераўтварэнняў на прадпрыемствах з канкрэтнымі крокамі мясцовых уладаў па развіццю рэгіёнаў.

Фактычна ідэальная эканоміка – гэта адзіны кластэр, у якім дзейнічаюць і аказваюць спрыяльны ўплыў на бізнес усе важныя інстытуты грамадства, забяспечваецца

каардынацыя ведаў і стымулюецца пастаянны працэс навучання, які ляжыць у аснове інавацыйнасці на прадпрыемствах. Сфармаваць такое асяроддзе – гэта важная, цяжкавыканальная і часта маларэальная задача палітыкі дзяржавы.

1.3. Перавагі і абмежаванні функцыянавання галіновых кластэраў

Як адзначалася вышэй, палітыка падтрымкі развіцця кластэраў мае вялікую папулярнасць. Стандартным абгрунтаваннем кластэрнай палітыкі лічыцца тое, што яна садзейнічае прапанове грамадскіх дабротаў, якія на мясцовым і рэгіянальным узроўні адсутнічаюць у выніку правалаў рынку. Прычым, як правіла, выдзяляюць чатыры разнавіднасці такіх дабротаў.

Па-першае, кластэрная палітыка падкрэслівае перавагі стварэння **сетак супрацоўніцтва і дыялогу** паміж фірмамі і іншымі суб'ектамі. У такіх сетках, як правіла, фірмы могуць абмяняцца інфармацыяй, атрымаць рэсурсы, дасягнуць калектыўнага рашэння і г.д. Так пэўныя кластэрныя ініцыятывы пачынаюцца з назначэння свайго роду «брокераў» і пасярэднікаў для правядзення падобных дыялогаў.

Па-другое, кластэрныя ініцыятывы ўключаюць **калектыўны маркетынг** спецыялізацыі рэгіёна, што павышае ўсведамленне моцных бакоў прамысловасці рэгіёна. Такая кластэрная палітыка з'яўляецца адносна таннай формай рэгіянальнай палітыкі.

Па-трэцяе, лічыцца, што мэтай кластэрнай палітыкі павінна быць забеспячэнне **мясцовымі паслугамі** прадпрыемстваў: такімі, як фінансавыя кансультацыі, службы маркетынгу і дызайну. Паслугі павінны быць накіраваны на канкрэтную спецыялізаваную дзейнасць мясцовых фірмаў. Напрыклад, развіццё сувязяў з падыходзячым універсітэтам, які мае даследчую базу.

Па-чацвёртае, лічыцца, што кластэрныя ініцыятывы павінны ідэнтыфікаваць слабыя звенні ланцугоў дададзенай вартасці кластэру і **прыцягваць інвестараў і бізнес** для запаўнення гэтых разрываў і ўзмацнення сувязяў попыт-прапанова.

Пры практычнай рэалізацыі такіх ініцыятываў узнікае шмат пытанняў. У якіх межах павінна праводзіцца такая палітыка? Якія прадпрыемствы павінны быць ахоплены? Для рэгіянальных уладаў пераходных краінаў галоўным пытаннем з'яўляюцца фінансавыя сродкі на правядзенне такой палітыкі. У той жа час рэгіянальны кіраўнік з дастатковымі паўнамоцтвамі, ведамі і жаданнем дабіцца росту дабрабыту рэгіёна і без кластэрнай ініцыятывы прыме рашэнні аб паляпшэнні інфраструктуры, сферы паслугаў, адукацыі і г.д. З другога боку, ці не будзе меншым злом дазволіць большыя паўнамоцтвы ў правядзенні прамысловай палітыкі менавіта рэгіянальным, а не цэнтральным уладам?

Для большай пэўнасці прывядзем у табліцы 4 найбольш верагодныя патэнцыйныя перавагі і недахопы кластэраў[1].

Табліца 4 – Патэнцыйныя перавагі і недахопы кластэраў

Дэкларуемыя перавагі	**Патэнцыйныя недахопы**
Вышэй эканамічны рост	Рост цаны працы
Вышэй прадукцыйнасць	Рост цэнаў на зямлю і наём жылля
Рост прыбытковасці	Рост дыферэнцыяцыі даходаў
Рост канкурэнтаздольнасці	Празмерная спецыялізацыя
Ствараецца больш новых фірмаў	Інстытуцыянальныя пасткі
Рост інавацыйнасці	Магчымы рост забруджвання навакольнага асяроддзя
Вышэй рост занятасці	Іншаземныя паглынанні

Спынімся больш падрабязна на некаторых магчымых недахопах. Празмерная спецыялізацыя можа абярнуцца сур'ёзнай рызыкай у выпадку рэзкага змянення вонкавых умоваў. Пры недыверсіфікаванасці кластэру, арыентацыі яго на адзін від дзейнасці, змены вонкавай кан'юнктуры могуць прывесці да высокага беспрацоўя ў выніку разрыву кантрактаў, фінансавага крызісу і г.д.

Крызісу ў час спаду 2001 г. не пазбегла нават славутая Сіліконавая даліна. У 2001 г. 150 буйнейшых кампаніяў (SV150) гэтага каліфарнійскага кластэру знізілі продаж на 18%, у 2002 г. продаж узрос на 5,5% і толькі ў 2003 г. рост стаў больш значным — амаль 11%. Але пра пераадоленне спаду ўсімі фірмамі пакуль гаварыць рана. Толькі 61% кампаній завяршылі 2003 г. з прыбыткам. Тым ня менш, рынкавая вартасць акцыяў 150 буйнейшых

[1] Непажаданыя наступствы канцэнтрацыі і «перагрэву» эканомікі як яе выніку адзначаў яшчэ А.Маршал: «Перавагі разнастайнасці відаў занятасці спалучаюцца з перавагамі канцэнтрацыі вытворчасці ў некаторых нашых прамысловых гарадах, і гэта служыць галоўнай прычынаю іх пастаяннага росту. Але, з другога боку, плошча цэнтральных раёнаў буйнога гораду ўяўляе такую вялікую каштоўнасць для гандлёвых прадпрыемстваў, што зямельная рэнта там аказваееца нашмат вышэй, чым тая, якую могуць дазволіць сабе плаціць прамысловыя прадпрыемствы нават з улікам адзначанай наяўнасці первагаў; аналагічная канкурэнцыя ўзнікае паміж служачымі гандлёвых фірмаў і фабрычнымі рабочымі за жылыя памяшканні. У выніку фабрыкі цяпер канцэнтруюцца не ў саміх буйных гарадах, а на іх ускраінах і ў прамысловых раёнах па суседству з імі» [17, т. 1, с. 354]. Цытата прыводзіцца толькі як ілюстрацыя вынікаў канцэнтрацыі, паколькі ў сённяшніх умовах рост долі сферы паслугаў у буйных гарадах і выцясненне вытворчасцяў за гарадскія межы – гэта нармальная з'ява (значны рынак збыту для паслугаў), якая адначасова дазваляе зменшыць экалагічную нагрузку на гарадскую тэрыторыю.

кампаніяў хоць і ўзрасла на 64% за апошні год і дасягнула амаль 1 трлн. далл, але гэта ўсяго каля паловы ад дакрызіснай велічыні.

У Сіліконавай даліне спраўджваецца і пагроза росту цэнаў. Так, мясцовыя кошты пражывання ў 2004 г. былі на 47% вышэй, чым у сярэдні па ЗША. Аднак і сярэдняя заработная плата перавышала ўзровень краіны на 60%. Важна заўважыць, што нягледзячы на рост продажаў занятасць у гэтым высокатэхналагічным кластэры памяншаецца. Так, у 2004 г. кампаніі са спісу SV150 скарацілі персанал на 38 тыс. чалавек або на 4%. Прычым, згодна з данымі аналітыкаў кампаніі-старажылы ў апошняе дзесяцігоддзе амаль не ствараюць працоўных месцаў: «фірмы, заснаваныя пасля 1990 г. стварылі амаль усе працоўныя месцы ў 1990-2001 гг.» [40].

Крызіс кластэраў можа быць выкліканы таксама чыста ўнутранымі прычынамі. Найбольш паказальнай з'яўляецца пастка ўстаноўленага вобразу думак і дзеянняў, калі, напрыклад, фірмы пастаянна ўдасканальваюцца ў некаторых спецыялізаваных параметрах, але не могуць адаптавацца да больш радыкальных зменаў у прадукце, тэхналогіі, эканамічнай кан'юнктуры (так званы эфект паталагічнай гамеастазы).

Выклікае пытанне таксама рэкамендацыя Портэра адносна таго, што ў выніку росту цэнаў у межах кластэру, «менш кваліфікаваныя фірмы і прадукцыйныя віды дзейнасці павінны пераходзіць у іншыя месцы» [3]. Напрыклад, калі гэтыя «адсталыя» галіны працаёмістыя, то вынікам іх «перасялення» можа быць высокае беспрцоўе на мясцовымм рынку працы.

Праблемы ў межах кластэру могуць быць вынікам спецыялізацыі. Як паказаў П.Маскел [19], у выніку стварэння спецыялізаваных інстытутаў падтрымкі вызначанай галіны, гэтыя структуры могуць непасрэдна або ўскосна выцясняць іншыя віды дзейнасці.

Такім чынам, разам з перавагамі існавання кластэраў іх існаванне можа нараджаць і пэўныя праблемы, пра што трэба памятаць пры планаванні разнастайных кластэрных ініцыятываў. З другога боку, эканамічныя праблемы і дыспрапорцыі з'яўляюцца неад'емнай часткаю рынкавай эканомікі.

2 Распрацоўка методыкі вызначэння месцазнаходжання і характарыстык прамысловых кластэраў у Беларусі і Польшчы

2.1 Лакалізацыйны аналіз

Сярод шматлікіх метадаў рэгіянальнага аналізу бадай самым распаўсюджаным з'яўляюцца паказальнікі ацэнкі размяшчэння прамысловасці, у тым ліку новых прадпрыемстваў. Як слушна адзначае Ў.Ізард [5, с. 6], гэта звязана з тым, што лакалізацыя новых відаў дзейнасці ў рэгіёне стварае новыя месцы працы, генеруе дадатковыя даходы, якія могуць выклікаць значныя мультыплікатыўныя эфекты. Трэба усведамляць, што размяшчэнне новых галінаў адначасова вядзе да росту шкодных выкідаў, інтэнсіфікуе транспартныя праблемы, негатыўна уплывае на экасістэму. Аднак без новай эканамічнай дзейнасці і працоўных месцаў рэгіён не зможа дынамічна развівацца ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспектыве. Разам з тым узнікаюць пытанні: якія галіны прамысловасці і віды паслуг і ў якім маштабе эканамічна эфектыўныя для рэгіёну, і, наадварот, якія фактары абумоўліваюць размяшчэнне асобнага віду дзейнасці ў канкрэтным рэгіёне?

Для знаходжання адказу на першую частку пытання з пазіцыяў пазітыўнай эканомікі можна прапанаваць бадай толькі эмпірычны дослед і кампаратыўны аналіз. На аснове імітацыі наяўнасці некаторага віду дзейнасці ў рэгіёне і апісання яго характарыстык можна зрабіць пэўныя высновы аб наступствах яго з'яўлення або развіцця ў рэгіёне. Трэба быць вельмі асцярожнымі ў вынясенні нарматыўных рэкамендацыяў, якія датычаць умяшальніцтва ў натуральны рынкавы працэс. Пад маскай павышэння грамадскага дабрабыту шляхам падтрымкі развіцця некаторага віду дзейнасці часта можа быць схаванае лабіраванне прыватных інтарэсаў.

Больш плённай у кантэксце росту грамадскага дабрабыту можа быць дапамога прадстаўнікам бізнесу з боку рэгіянальных уладаў і навукоўцаў у пошуку аптымальнай лакалізацыі іх дзейнасці. Безумоўна, фактары размяшчэння асобнага віду вытворчай дзейнасці або паслуг часта унікальныя. Аднак існуюць некаторыя базавыя фактары, якія прымаюцца пад увагу падчас прыняцця рашэння адносна размяшчэння. Па-першае, доступ і кошты сыравіны і матэрыялаў, прамежкавай прадукцыі (камплектавальных вырабаў), патрэбных відаў паслуг, а таксама капіталу, працы, энергіі як ў дадзеным рэгіёне, так і ў іншых. Па-другое, доступ і кошты дастаўкі на рынак, зноў жа як ў дадзеным рэгіёне, так і ў іншых. Трэба заўважыць, што гістарычна рэгіянальных даследчыкаў ў большай ступені цікавілі фактары выдаткаў вытворчасці такіх традыцыйных галінаў як сталеапрацоўка, шкляная, цэментная, тэкстыльная прамысловасці, нафтаперапрацоўка і

нафтахімія. Як правіла, сцвярджалася, што галіны паслуг, якія адносна менш звязаныя узаемнымі пастаўкамі, лакалізуюцца там, дзе прысутнічае прамысловасць, хатнія гаспадаркі (пазней, рынкі збыту). Цяпер шмат што змянілася. Аднак прынцыпы і метады, якія дзесяцігоддзямі прымяняліся для традыцыйных сектараў прамысловасці, цяпер маюць вялікае значэнне для сучасных высокатэхналагічных галінаў і паслуг.

2.1.1 Метад параўнальных выдаткаў

Метад параўнальных выдаткаў (*comparative cost approach*) з'яўляецца найбольш шырока выкарыстоўваемым інструментам рэгіянальнага аналізу, які мае свае карані ў тэорыі міжнароднага гандлю. Мета вывучэння параўнальных выдаткаў – вызначыць, у якім рэгіёне або рэгіёнах канкрэтны від дзейнасці (галіна прамысловасці) можа мець найбольш нізкія выдаткі вытворчасці і дастаўкі прадукцыі на рынак.

Прычынамі для правядзення даследавання параўнальных выдаткаў могуць быць адкрыццё радовішча карысных выкапняў у рэгіёне; змяненне ў тэхналогіі, дзякуючы якому існыя мінеральныя выкапні можна больш прадукцыйна выкарыстоўваць; з'яўленне новых рынкаў збыту ў выніку палітычных зменаў; пабудова порту або буйнога транспартнага калідору, што значна зніжае кошты дастаўкі сыравіны або кошты транспартавання прадукцыі на рынак; рост рынку рэгіёну, што дазваляе мясцовым вытворчасцям выкарыстаць эфект маштабу; зрух у спажывецкіх перавагах; знаходжанне новых крыніц фінансавання і г.д.

Пасля пераліку магчымых сітуацыяў, пры якіх метазгодна вывучэнне параўнальных выдаткаў, апішам асноўныя працэдуры метаду. Перш за усё, неабходна валодаць дастатковай інфармацыяй пра агульныя выдаткі вытворчасці галіны ў дадзеным рэгіёне і ў рэгіёнах, дзе гэтая галіна функцыянуе, або ў якіх яна патэнцыйна можа мець ніжэйшыя выдаткі. Рэгіён або рэгіёны з самымі нізкімі коштамі вытворчасці і транспартавання на дадзены рынак будуць найбольш пажаданымі пляцоўкамі для абслугоўвання гэтага рынку. Паколькі важнай для параўнання велічынёй з'яўляецца менавіта розніца ў коштах вытворчасці па рэгіёнах, то зразумела, што вывучэнне параўнальных выдаткаў трэба праводзіць толькі па тых элементах выдаткаў, якія сапраўды адрозніваюцца па рэгіёнах (*cost differentials*). Напрыклад, калі энергетычныя тарыфы аднолькавыя ва усіх рэгіёнах, то гэты элемент выдаткаў можна не прымаць у разлік.

Каб праілюстраваць ключавую ролю адрозненняў у коштах і выкарыстанне прынцыпаў размяшчэння прааналізуем фактары лакалізацыі на прыкладзе металургічнай прамысловасці. Гістарычна склалася так, што паколькі для выплаўкі сталі патрабавалася 10 тонаў вугалю, 2-3 тоны жалезнай руды і трохі вапняку, то металургічныя вытворчасці

размяшчаліся паблізу месца здабычы вугалю. Пры прыняцці рашэнняў аб лакалізацыі металургічных прадпрыемстваў дамінуючымі адрозненнямі па коштах былі транспартныя выдаткі. Было больш эфектыўна транспартаваць 2-3 тоны руды да вугальнай пляцоўкі і тону гатовай прадукцыі на рынак, чым 10 тонаў вугалю перавезці да радовішча руды або да рынку збыту. Гэта справядліва нават калі радовішча руды і рынак збыту знаходзяцца ў адным месцы. Гэты вынік ілюструе адзін з прынцыпаў размяшчэння, згодна з якім вытворчасць лакалізуецца ў месцы, дзе агульная вага перавозак на адзінку адлегласці мінімальная. Дапаўняльны прынцып заключаецца ў тым, што распаўсюджаны матэрыял мае невялікае (або не мае зусім) лакалізацыйнае значэнне[1].

Астатнія лакалізацыйныя прынцыпы разгледзім на прыкладзе вывучэння параўнальных выдаткаў размяшчэння металургічнага прадпрыемства ў Новай Англіі (рэгіён, які складаецца з шасці штатаў на паўночным усходзе ЗША), ініцыянаванага ў 1951 г. Бостанскім федэральным рэзервовым банкам з мета пераадолець паніжэнне эканамічнай актыўнасці ў гэтым рэгіёне (малюнак 2).

Металургічны сектар у ЗША ў разглядаемы перыяд быў пад значным уплывам прафсаюзаў. Таму нягледзячы на тое, што працоўныя выдаткі з'яўляліся самым вялікім артыкулам сабекошту сталі, даследчыкам не выпадала надаваць гэтаму фактару лакалізацыйнае значэнне, паколькі ў выніку дзеянняў прафсаюзаў рэгіянальныя адрозненні ў зарплаце элімінаваліся. Новая Англія мае неабмежаваны доступ да фінансавага рынку Нью-Йорку, які знаходзіцца на паўднёвай мяжы рэгіёну, таму кошты капіталу таксама не будуць адрозніваццa ў межах разглядаемай тэрыторыі. Рэгіён складаецца з некалькіх штатаў, дзе можа адрозніваццa падатковая палітыка. Аднак, паколькі улады штатаў могуць уплываць на узровень падаткаабкладання ў абмежаванай ступені і змяненне памераў падаткаў у розных напрамках малаверагодна, то гэты фактар наўрад ці будзе граць лакалізацыйную ролю. Нарэшце, выдаткі, звязаныя з кантролем брудных выкідаў у разглядаемы перыяд яшчэ не дасягнулі адчувальнага памеру. Такім чынам, у 1951 г. асноўныя адрозненні лакалізацыйных выдаткаў металургіі ў Новай Англіі заключаліся ў коштах транспартавання (табліца 5).

[1] Напрыклад, напачатку XX ст. адносна чыстая вада была даволі распаўсюджанай, таму не было патрэбы яе транспартаваць з іншых месцаў. Зараз гэта не так, і для некаторых вытворчасцяў наяўнасць чыстай вады становіцца фактарам лакалізацыі (лакалізацыйнае значэнне вады ўзрасло).

Малюнак 2. Існыя і гіпатэтычныя металургічныя прадпрыемствы, якія абслугоўваюць рынак сталі Бостана [5, с. 11]

Табліца 5 – Транспартныя выдаткі на сыравіну для вырабу 1 тоны сталі і яе дастаўку на рынак Бостана для існых і гіпатэтычных металургічных прадпрыемстваў, даляраў

Размяшчэнне	Транспартныя выдаткі на дастаўку			
	руды	вугалю	гатовай прадукцыі	усяго
Фол-Рывер	3,68	5,63	4,60	13,91
Нью-Лондан	3,68	5,42	6,80	15,90
Пітсбург	5,55	1,56	15,20	22,31
Кліўленд	3,16	3,85	15,20	22,21
Спэроўз Поінт	3,68	4,26	12,40	20,34
Буфала	3,16	4,27	12,60	20,03
Бэтлехем	5,56	5,06	10,60	21,22
Трэнтан	3,68	4,65	10,40	18,73

Згодна з дадзенымі табліцы 5, для абслугоўвання рынку Бостана можна ідэнтыфікаваць два месцы: Фол-Рывер (штат Масачусетс) і Нью-Лондан (штат Канекцікут). Кошты на гэтых пляцоўках параўноўваюцца з коштамі на існых прадпрыемствах (Пітсбург, Кліўленд, Спэроўз Поінт, Буфала, Бэтлехем) і выдаткамі ў найлепшым альтэрнатыўным месцы. У выпадку Новай Англіі найлепшай альтэрнатывай з'яўляецца Трэнтан (штат Нью-Джэрсі), які знаходзіцца па-за тэрыторыяй разглядаемага рэгіёну. Напомнім, што базавым прынцыпам метаду параўнальных выдаткаў з'яўляецца супастаўленне выдаткаў дзейнасці не толькі існых месцазнаходжанняў прадпрыемстваў, але і тых, якія не існуюць, але з'яўляюцца найлепшай альтэрнатыўнай лакалізацыяй некаторага віду дзейнасці. Існыя і гіпатэтычныя металургічныя прадпрыемствы, якія абслугоўваюць рынак сталі Бостана, прыведзены на малюнку 2.

Прааналізуем больш дэталёва табліцу 5. Для яе падрыхтоўкі па кожнай вытворчай пляцоўцы ацэньваліся выдаткі на аб’ём жалезнай руды, неабходнай для вытворчасці тоны сталі. Паколькі разглядаемыя пункты размяшчэння могуць выкарыстоўваць некалькі крыніц руды і паколькі яе якасць розная, то на выплаўку сталі ў розных месцах будзе патрабавацца неаднолькавы аб’ём руды. Таксама, розныя аб’ёмы вугалю будуць патрабавацца для працэсу плаўкі. Адлюстраваныя ў другім слупку табліцы 5 транспартныя выдаткі кожнай пляцоўкі на патрабуемы аб’ём руды для вырабу 1 тоны сталі разлічаныя з улікам вышэйсказанага, г. зн. прыведзеныя да супаставімасці. Адрозненні паміж транспартнымі выдаткамі на пастаўку руды, такім чынам адлюстроўваюць розніцы выдаткаў размяшчэння (*locational cost differentials*). Трэці слупок табліцы 5 адлюстроўвае транспартныя выдаткі на дастаўку вугалю з лепшай для кожнай пляцоўкі крыніцы. Чацвёрты слупок змяшчае кошты дастаўкі сталі на рынак Бостана. Нарэшце, апошні слупок адлюстроўвае суму папярэдніх і паказвае, што як Фол-Рывер, так і Нью-Лондан маюць перавагі ў транспартных выдатках ў параўнанні з іншымі разгледжанымі мясцовасцямі пры абслугоўванні рынку Бостана. Паколькі адрозненні ў іншых выдатках або адсутнічаюць, або нязначныя ці непрадказальныя, то на аснове вышэйпрыведзенага аналізу можна было б заключыць, што лакалізацыя новага металургічнага прадпрыемства ў Новай Англіі эканамічна метазгодная.

Аднак існуюць іншыя фактары, якія не маюць непасрэдных адносінаў да размяшчэння. Адзін з іх, прычым вельмі важны, — гэта эканомія ад маштабу вытворчасці. Як вядома, сабекошт адзінкі прадукцыі падае з ростам выпуску да некаторага значэння апошняга, пасля гэтага значэння аб’ёму вытворчасці сабекошт адзінкі прадукцыі пачынае расці. Пасля ацэнкі ёмістасці усіх рынкаў сталі Новай Англіі высветлілася, што пабудаваны завод з аптымальным памерам для рэалізацыі эфекту маштабу (які

дасягаецца пры выпуску не менш 3 млн. тонаў сталі ў год) будзе незагружаны. Прычым, ёмістасць рынку не будзе дастатковай, калі нават узрасце на велічыню попыту іншых рэгіёну, якія здолее дасягнуць новае прадпрыемства з Фол-Рывер або Нью-Лондану, і нават тады, калі паменшыцца аб'ём паставак сталі на рынак Новай Англіі з па-за межаў рэгіёну. Без дасягнення эфекту маштабу вытворчасці ніводная прыватная металургічная кампанія не прыме рашэння будаваць філіял у Новай Англіі.

Далейшае даследаванне паказала, што найлепшы альтэрнатыўны раён размяшчэння — Трэнтан (штат Нью-Джэрсі) — мае значныя перавагі па транспартных выдатках пры абслугоўванні рэгіёну Вялікі Нью-Йорк–Філадэльфія, памер рынку якога ацэньваецца ў 9-11 млн. тонаў у год. Прычым рынак гэтага рэгіёну расце. Такім чынам, пацвердзілася, што размяшчэнне там новага прадпрыемства дазволіць дасягнуць эфекту маштабу. Такі металургічны завод сапраўды быў пабудаваны каля Трэнтана.

Трэба зазначыць, што нават належным чынам выкананае даследаванне параўнальных выдаткаў можа быць выкарыстана галоўным чынам у кароткатэрміновым перыядзе. Даследаванне дазваляе адлюстраваць сітуацыю ў дадзены перыяд часу. Калі ж рэч ідзе аб значных капіталаўкладаннях, якія, як у выпадку металургічнай прамысловасці, цяжка рэінвеставаць, то неабходна прагназаваць паводзіны эканамічнага асяроддзя, часам у маштабах свету. А гэта цяжкая, у некаторых выпадках амаль безнадзейная задача. Аднак важнасць гэтай задачы яскрава ілюструе нядаўняя гісторыя металургічнай прамысловасці ЗША. Як адзначалася вышэй, пры аналізе яе параўнальных выдаткаў не прымалі пад увагу кошты працы, што было ў цэлым абгрунтавана, калі прымаць пад увагу толькі рэгіёны ЗША. Амаль ніхто з аналітыкаў не прымаў усур'ёз магчымасць значнага імпарту з Японіі, Паўднёвай Карэі і іншых краінаў. Але гэта сапраўды адбылося. Японскія і паўднёва-карэйскія заводы здолелі перамагчы ў канкурэнтнай барацьбе існыя арыентаваныя на рынкі збыту амерыканскія прадпрыемствы пераважна за кошт вельмі нізкіх коштаў працы. У рэчаіснасці, як бачым, металургічная прамысловасць пераўтварылася з транспарт-арыентаванай або арыентаванай на рынак ў арыентаваную на выдаткі працоўнай сілы[1].

[1] Да сярэдзіны XX ст. металургію можна было характарызаваць як галіну пры прасторавым размяшчэнні якой дамінавала велічыня транспартных выдаткаў (заводы размяшчаліся бліжэй да крыніцаў здабычы вугалю). З сярэдзіны XX ст. тэхнічны прагрэс дазволіў значна знізіць расход вугалю на выплаўку адзінкі прадукцыі. У выніку фактары размяшчэння металургіі зрушыліся ў бок рынкаў збыту (арыентацыя на рынкі збыту), прычым дастаткова вялікага памеру для рэалізацыі эфекту маштабу. На сучасным этапе на пярэдні план выступаюць выдаткі на працоўныя рэсурсы. Цікава адзначыць, што ў пачатку XIX ст. тэкстыльная прамысловасць была арыентаваная на размяшчэнне на гідраэнергетычных пляцоўках. (Гэта ілюструе відавочны і ў той жа час базавы прынцып лакалізацыі: калі для вытворчасці патрабуецца немабільны, але абавязковы фактар, то вытворчасць павінна размяшчацца каля крыніцы гэтага рэсурсу.) Калі ж стала агульнадаступнай электраэнергія, то тэкстыльная вытворчасць магла перамясціцца да больш таннай працоўнай сілы. У выніку, розніца ў працоўных выдатках стала дамінаваць.

Сучасныя фактары размяшчэння металургічнай прамысловасці ілюструе даследаванне, праведзенае па Паўночнай Карэі. У 1995 г. штогадовы памер рынку сталі Паўднёвай Карэі, па ацэнках, павінен вырасці да 15 млн. тонаў у 2004 г. Акрамя таго, даследчыкі дапусцілі, што калі Паўночная Карэя прапануе дастаткова нізкія цэны, то пабудаваны завод здолее пранікнуць на рынкі Японіі, Тайваня і захаду ЗША. Належыць адзначыць, што ў Паўночнай Карэі маюцца шматлікія запасы жалезнай руды, прычым запасы руды сярэдняй якасці (30-37% жалеза) на захадзе краіны (рэгіён Чанджын) складаюць 1,3 млрд. тонаў. Маюцца залежы вугалю, аднак недастатковай для выплаўкі сталі якасці, таму яго трэба экспартаваць. Што датычыць транспартных магчымасцяў, то Чанджын з'яўляецца буйнейшым портам Паўночнай Карэі, усходні бераг якога выдатна падыходзіць для экспансіі ў папуляцыі і прамысловыя сканцэнтраванні ў Японіі, Тайваня і захаду ЗША. Акрамя таго, сам рэгіён Чанджын з'яўляецца буйной урбанізаванай тэрыторыяй, што дазволіць пашырыць продажы выробленай сталі для далейшай перапрацоўкі з мета задавальнення унутранага спажывецкага попыту. Параўнальныя выдаткі выпрацоўкі сталі ў Чанджыне ў параўнанні з існым прадпрыемствам ў Кванджане (Паўднёвая Карэя) і гіпатэтычнай альтэрнатывай размяшчэння ў Кунзане (Паўднёвая Карэя) прыведзеныя ў табліцы 6.

Табліца 6 – Параўнальныя выдаткі вырабу 1 тоны сталі і яе дастаўкі на рынак Паўднёвай Карэі і Японіі, даляраў

№	Крыніца выдаткаў	Месца вытворчасці		
		Чанджын (Паўночная Карэя)	Кунзан (Паўднёвая Карэя)	Кванджан (Паўднёвая Карэя)
1.	Жалезная руда	51	49	49
2.	Вугаль	39	37	37
3.	Металалом	53	50	48
4.	Праца	35	80	80
5.	Прыродаахоўныя кошты ў параўнанні з Чанджынам	0	++	+++
6.	Агульныя выдаткі вытворчасці	178	216++	214+++
7.	Транспартныя выдаткі да рынку Паўднёвай Карэі	23	5	5
8.	Кошты вытворчасці пры дастаўцы ў Паўднёвую Карэю	201	221++	219+++
9.	Транспартныя выдаткі да рынку Японіі	28	28	28
10.	Кошты вытворчасці пры дастаўцы ў Японію	206	244++	242+++

Радок 1 паказвае кошты руды з улікам неабходнасці яе узбагачэння ў Чанджыне. Выдаткі на вугаль (радок 2) узятыя для рынку Паўднёвай Карэі з улікам большай

дыстанцыі марской перавозкі. Расходы на металалом (радок 3) на гіпатэтычных пляцоўках большыя, чым справаздачныя для Кванджана, што адлюстроўвае меншую прапанову гэтага рэсурсу ў мясцовасцях патэнцыйнай дыслакацыі новага заводу.

У радку 4 прыводзяцца кошты працы. Прычым для Паўночнай Карэі яны разлічаныя на аснове шэрагу дапушчэнняў, а менавіта, што паўночна-карэйская працоўная сіла напалову менш прадукцыйная і што аплата гадзіны працы ў Кванджане будзе складаць чвэрць ад паўднёва-карэйскай. Радок 5 дае візуальную ацэнку выдаткаў, звязаных з аховай прыроднага асяроддзя. Для Паўднёвай Карэі яны прымаюцца большымі (+++), паколькі адносна высокая канцэнтрацыя прамысловасці і адпаведна большыя аб'ёмы выкідаў маюць вынікам рост рэгулявання і кантролю з боку мясцовых уладаў і большы высокія тарыфы за шкодныя выкіды. Кванджан адносна менш індустрыялізаваны і адпаведна менш забруджаны, і высокая верагоднасць таго, што ў сярэднетэрміновай перспектыве рэгіён будзе заставацца ў такім жа стане.

У радку 6 прыводзяцца агульныя выдаткі вытворчасці 1 тоны сталі. Можна бачыць, што нягледзячы на адносна больш дарагую сыравіну, Паўночная Карэя мае адчувальныя перавагі па выдатках, дзякуючы нізкай аплаце працы. Аднак трэба прыняць пад увагу выдаткі транспартавання. Як паказвае радок 7, дастаўка сталі на рынак Паўднёвай Карэі ў сувязі з большай адлегласцю даражэйшая, чым для мясцовых заводаў. Большыя перавагі паўночна-карэйская сталь мае на японскім рынку, адлегласць да якога прыкладна роўная пры транспартаванні і з Паўднёвай Карэі.

Такім чынам, даследаванне параўнальных выдаткаў паказвае перавагі новага металургічнага прадпрыемства над бліжэйшымі канкурэнтамі. Безумоўна, пад увагу трэба браць іншыя адчувальныя да лакалізацыі фактары, такія як якасць менеджменту, палітычная стабільнасць, працоўная этыка і г.д. Тым не менш, прыведзены прыклад паказвае, што размяшчэнне прадпрыемстваў металургіі павінна кіравацца новай стратэгіяй, якая грунтуецца на параўнанні перш за усё працоўных і прыродаахоўных выдаткаў.

У прыведзеных вышэй прыкладах метад параўнальных выдаткаў грунтаваўся на колькаснай ацэнцы розніцаў у коштах транспартавання, працы, энергіі, сыравіны, зямельных і капітальных рэсурсаў, тарыфах на шкодныя выкіды і падаткаабкладанні. Іншыя важныя фактары лакалізацыі, такія як агламерацыйныя эфекты, што прыводзяць да эканоміі ад лакалізацыі і урбанізацыі (гл. вышэй), надзвычай цяжка выразіць колькасна, гэта своеасаблівыя экстэрналіі, вонкавыя эфекты, якія не рэгулююцца рынкам.

2.1.2 Паказальнік размяшчэння

Вышэй прыведзены аналітычны падыход выкарыстоўваецца, калі ў асобным рэгіёне ужо ідэнтыфікаваная галіна прамысловасці ці паслуг, перспектыўная для развіцця на яго тэрыторыі (асабліва, калі рэгіён валодае важным рэсурсам). Часцей, аднак, рэгіён, перад якім стаіць праблема актывізацыі эканамічнага росту або пераадолення высокага беспрацоўя, не ў стане ідэнтыфікаваць напрамак развіцця. Рэгіянальным аналітыкам можа быць патрэбная наступная інфармацыя: 1) якія галіны прамысловасці (віды дзейнасці) рэгіён мае і якіх не мае; 2) ступень, у якой кожная галіна прадстаўлена ў рэгіёне ў параўнанні, напрыклад, з краінай у цэлым; 3) ступень, у якой імпарт тавараў і паслуг у рэгіён можа быць зменшаны шляхам арганізацыі іх вытворчасці на яго тэрыторыі; 4) ступень, у якой выпуск экспартуючых галінаў рэгіёну метазгодна пашырыць для узмацнення вонкавага гандлю.

Для падрыхтоўкі інфармацыі, неабходнай для адказу на гэтыя узаемазвязаныя пытанні, часта выкарыстоўваецца такі інструмент як паказальнік размяшчэння (*location quotient*).

Паказальнік размяшчэння [5, с. 7-30] з'яўляецца інструментам для правядзення параўнанняў. Напрыклад, мы жадаем параўнаць адсоткавую долю занятых у галіне *i* для дадзенага рэгіёну *r* з доляю занятых у гэтай галіне па краіне ў цэлым. Тады мы маем

E_i^r — занятасць у галіне *i* ў рэгіёне *r.*

E_i — занятасць у галіне *i* па краіне ў цэлым.

E^r — агульная занятасць у рэгіёне *r.*

E — агульная занятасць па краіне ў цэлым.

Тады паказальнік размяшчэння будзе паказваць суадносіну адсоткавай долі занятых у галіне *i* ў рэгіёне *r* і ў краіне ў цэлым (E_i^r / E_i) з адсоткавай доляй агульнай занятасці ў рэгіёне *r* і ў краіне ў цэлым (E^r / E). Паказальнік выглядае наступным чынам [5, с. 25]:

$$Lq = \frac{E_i^r / E_i}{E^r / E}, \tag{1}$$

або, што эквівалентна:

$$Lq = \frac{E_i^r / E^r}{E_i / E} \tag{2}$$

Адзначым, што другая форма паказальніку размяшчэння прадстаўляе суадносіну долі занятых у галіне *i* ў агульнай занятасці рэгіёну *r* да долі занятых у галіне *i* ў агульнай нацыянальнай занятасці. Гэтую форму паказальніку размяшчэння з улікам розных індэксаў для кожнага рэгіёну можна адлюстраваць візуальна больш спрошчана:

$$Lq_{ir} = d_{ir} / d_i \qquad (3)$$

дзе $Lq_{ir\ i}$ – паказальнік размяшчэння галіны *i* па занятасці ў рэгіёне *r*;

d_{ir} – удзельная вага занятых галіны *i* ў занятасці рэгіёну *r*;

d_i – удзельная вага занятых галіны *i* ў занятасці краіны.

Калі азначаны паказальнік $Lq>1$, значыць, галіна прадстаўлена ў канкрэтным рэгіёне ў большай ступені, чым па краіне ў цэлым. Адпаведна, калі паказальнік размяшчэння $Lq\leq1$, то канкрэтная галіна ў рэгіёне не паказвае больш высокай канцэнтрацыі, чым у сярэднім па краіне.

Дзякуючы сваёй прастаце паказальнік размяшчэння з'яўляецца карысным інструментам на пачатковай стадыі разнастайных рэгіянальных даследаванняў. Аднак, каб пазбегнуць памылковых высноваў, яго трэба выкарыстоўваць уважліва. Напрыклад, разгледзім выкарыстанне паказальніку размяшчэння для ідэнтыфікацыі экспартуючых і імпартуючых галінаў рэгіёну. Часам, калі $Lq<1$, аналітык можа заключыць, што рэгіён імпартуе прадукцыю галіны *j*, і, наадварот, калі $Lq>1$, то экспартуе. Такая выснова можа быць памылковаю па шэрагу прычынаў.

Па-першае, густы і структура расходаў (схільнасць да спажывання) хатніх гаспадарак аднолькавага тыпу і ўзроўню даходаў па рэгіёнух можа значна адрозніваццa. Напрыклад, у больш цёплым рэгіёне патрабуецца значна меней паліва, чым у халодным. Ceteris paribus гэта азначае, што і пры $Lq\leq1$ для паліўнай прамысловасці цёплага рэгіёну можа назірацца значны экспарт паліва, а $Lq>1$ для халоднага рэгіёну можа супадаць з адначасовым імпартам паліўнай прадукцыі.

Па-другое, існуе дыферэнцыяцыя ўзроўняў даходаў хатніх гаспадарак па рэгіёнах. Напрыклад, паўночны ўсход ЗША спажывае значна больш мужчынскіх касцюмаў на хатнюю гаспадарку, чым паўднёвы ўсход. Таму $Lq>1$ для вытворчасці касцюмаў у апошнім рэгіёне можа назірацца адначасова з іх вялікім імпартам. Наадварот, $Lq\leq1$ для паўночнага ўсходу не выключае значнага экспарту мужчынскіх касцюмаў.

Па-трэцяе, характарыстыкі вытворчасці рэгіёнаў (у тым ліку рэгіянальная прадукцыйнасць працы), галіновы склад (структура) прамысловасці значна вар'юць па

рэгіёнах. Напрыклад, паказальнік размяшчэння электраэнергетыкі можа перавышаць адзінку таму, што на дадзенай тэрыторыі адносна высокая канцэнтрацыя энергаёмістых вытворчасцяў. Таму рэгіён зусім не экспартуе электраэнергію, як можна было б меркаваць па велічыні паказальніку размяшчэння.

Як бачым, асобнае выкарыстанне паказальніку размяшчэння можа прывесці да памылковых высноваў. Аднак ён можа даваць каштоўныя вынікі ў спалучэнні з вытворчымі і спажывецкімі функцыямі, улікам рэгіянальнай дыферэнцыяцыі спажывецкіх схільнасцяў і узроўню даходаў, характарыстык рэгіянальнай прамысловасці і асаблівасцяў яе структуры.

Трэба адзначыць, што пры разліку паказальніку размяшчэння можна выкарыстоўваць розныя базы параўнання. Калі даследчыка цікавіць прасторавая канцэнтрацыя галіны прамысловасці, то ў якасці базы замест агульнай занятасці можа быць прынятая мера геаграфічнай плошчы (км^2). Калі прадметам даследавання з'яўляецца размяшчэнне сферы паслугаў (напрыклад, бальніц), то ў якасці базы можна выкарыстаць агульную колькасць насельніцтва, што дазволіць ацаніць, як забяспечваюцца гэтымі паслугамі жыхары канкрэтнага рэгіёну адносна сярэдняга узроўню краіны. У якасці базы параўнання даволі шырока ужываецца агульны даход (дададзеная вартасць), аднак па рэгіёнах Беларусі такія разлікі не робяцца. У той жа час выкарыстоўваць пры разліках *Lq*, скажам, валавы выпуск галінаў эканомікі было б памылкова, паколькі гэтая велічыня утрымлівае выдаткі мінулай працы, у выніку чаго велічыня *Lq* можа прывесці да памылковых высноваў.

2.1.3 Каэфіцыент лакалізацыі

У дадатак да паказальніку размяшчэння ў шэрагу выпадкаў выкарыстоўваецца каэфіцыент лакалізацыі (*localization coefficient*). Для яго пабудовы неабходна: 1) для кожнага рэгіёна краіны падлічыць долю занятых у галіне *i* адносна нацыянальнай занятасці ў гэтай галіне і долю рэгіёну ў агульнай нацыянальнай занятасці; 2) разлічыць розніцу паміж гэтымі велічынямі; 3) падлічыць суму толькі дадатных (або толькі адмоўных) розніцаў па усіх рэгіёнах і падзяліць яе на 100. Напрыклад, зыходзячы з даных табліцы 7, для разліку каэфіцыенту трэба суму дадатных розніцаў (+20) падзяліць на 100, што дае значэнне каэфіцыенту лакалізацыі *Lc*= 0,2.

Чым вышэйшы каэфіцыент лакалізацыі, тым больш высокая канцэнтрацыя некаторай галіны.

Табліца 7 – Даныя для разліку каэфіцыенту лакалізацыі [5, с. 27]

Паказальнік	Рэгіён			
	A	B	C	D
1. Доля занятых у галіне *i* рэгіёна ў нацыянальнай занятасці ў гэтай галіне, %	20	30	35	15
2. Доля рэгіёну ў агульнай нацыянальнай занятасці, %	15	20	30	35
Розніца (радок 1 – радок 2)	+5	+10	+5	–20
Каэфіцыент лакалізацыі (*Lc*)	0,2			
Паказальнік размяшчэння (*Lq*)	1,33	1,5	1,17	0,43

Як і пры разліку паказальніку размяшчэння, *Lc* можна разлічыць з выкарыстаннем не толькі агульнай занятасці, а, напрыклад, плошчы, агульнай колькасці насельніцтва. У выніку атрымліваецца паказальнік, які часта называюць каэфіцыентам геаграфічнай асацыяцыі (*coefficient of geographic association*).

2.2 Параўнальны аналіз і выбар аптымальнага метаду лакалізацыі кластэраў

Для даследавання галіновых кластэраў выкарыстоўваюцца розныя метадалагічныя падыходы, якія залежаць, па-першае, ад геаграфічнага ўзроўню (рэгіянальны, лакальны, сектарны), на якім даследуюцца кластэры, па-другое, ад даступных даных (як статыстычных, так і якасных, анкетных). Асноўныя падыходы, на якіх можа быць пабудаваны апарат даследавання кластэраў, акрамя апісанага вышэй інстурментаў лакалізацыйнага аналізу, прыводзяцца ніжэй.

2.2.1 Выдаткі-выпуск (input-output)

Метад выдаткі-выпуск заснаваны на аналізе гандлёвых сувязяў паміж вытворчымі сектарамі, якія адлюстроўваюцца матрыцай міжгаліновага балансу. У выпадку аналізу кластэрных сувязяў метад дапамагае адлюстраваць узаемаадносіны “пакупнік-прадавец” унутры і паміж кластэрамі. Існуе некалькі падыходаў для ранжыравання прадпрыемстваў і сектараў праз адносіны «выдаткі-выпуск». Гэта, напрыклад, метад трыянгуляцыі (*triangularization*) і аналіз галоўных кампанентаў (*factor/principal components analysis*) [5, с. 26]. Важным для практычнага выкарыстання ў даследаваннях галіновых кластэраў з'яўляецца наяўнасць шэрагу падыходаў (*regional purchases coefficients, location quotient techniques, the RAS approach*) для пабудовы матрыц простых выдаткаў для асобнага рэгіёну на аснове тэхналагічнай матрыцы для краіны ў цэлым.

У некаторых краінах OECD на аснове метаду выдаткі-выпуск распрацоўваюцца матрыцы інавацыйнасці (Community Innovation Survey у ЕС [41]).

У сувязі з высокай працаёмістасцю разлікаў міжгаліновага балансу для асобнага рэгіёну на дадзеным этапе гэты метад выкарыстаць праблематычна. Распрацоўка ж матрыц простых выдаткаў для асобнага рэгіёну на аснове тэхналагічнай матрыцы для краіны ў цэлым магчыма як мінімум з двухгадовым лагам (міжгаліновы баланс краіны распрацоўваецца са спазненнем у 1,5 года), да таго ж гэтыя падыходы будуць толькі прыбліжана апісваць рэальныя вытворчыя ўзаемасувязі ў рэгіёне, не даючы неабходнай дэталізацыі (напрыклад, гаспадарчыя адносіны прадпрыемстваў і даследчыцкіх установаў).

2.2.2 Графічны аналіз

Графічны аналіз падобны на метад “выдаткі-выпуск” і заснаваны на тэорыі графаў (*graph theory*). З яго дапамогай ідэнтыфікуюцца разнастайныя сувязі паміж фірмамі або сектарамі.

2.2.3 Даследаванне прыкладаў (*case studies*) і экспертная ацэнка (*expert opinion*)

Бальшыня даследаванняў кластэраў выкарыстоўвае падыходы даследавання прыкладаў (*case studies approach*) і экспертнай ацэнкі (*expert opinion approach*). У якасці экспертаў выступаюць прадстаўнікі вядучых прадпрыемстваў рэгіёну, дзяржаўнай улады і асобы, якія прымаюць адказныя рашэнні ў рэгіёне. Гэтыя людзі з’яўляюцца важнай крыніцай інфармацыі пра эканамічныя тэндэнцыі ў рэгіёне і яго характарыстыкі, слабыя і моцныя бакі. Пры выяўленні кластэраў з дапамогай экспертных ацэнак выкарыстоўваюцца прамысловыя справаздачы, газетныя публікацыі і іншыя крыніцы інфармацыі. Гэты падыход часта спалучаецца з выкарыстаннем ромба Портэра (*Porter’s diamond approach*) [3, с. 176].

Важнай крыніцай мікраэканамічнай інфармацыі пра існыя сувязі і асяроддзе функцыянавання канкрэтнай галіны ў некаторым рэгіёне або ў маштабе краіны з’яўляецца даследаванне прыкладаў у выглядзе анкетнага апытання або інтэрв’ю прадстаўнікоў прадпрыемстваў, якія маюць падставы ўваходжання ў галіновы кластэр. Атрыманыя такім чынам «якасныя» даныя дазволяць удакладніць высновы, зробленыя на падставе аналізу статыстычных дадзеных, зробленага, у прыватнасці, з дапамогаю паказальніку размяшчэння.

2.2.4 Паказальнік выяўленых канкурэнтных пераваг (*revealed comparative advantage - RCA measure*)

Паказальнік выяўленых канкурэнтных пераваг паказвае долю экспарту кожнага сектару ў агульным экспарце рэгіёну ў адносінах да сярэдняй долі экспарту краіны ў цэлым. У заходніх краінах базай параўнання служыць сярэдняя велічыня долі экспарту ў 13 краінах АЭСР (*OECD*). Тады нацыянальныя кластэры будуць знаходзіцца ў галінах з высокай доляй экспарту ў параўнанні да RCA-індэксаў краіны (групы краін). Напрыклад, калі краіна (рэгіён) мае значэнне RCA-індэксу 8,5 у будаўніцтве статкаў, гэта значыць, што краіна (рэгіён) мае ў 8,5 разоў большую долю ў экспарце караблёў, чым сярэдняя па краінах АЭСР (*OECD*).

Кожны з прадстаўленых спосабаў выяўлення галіновых кластэраў мае абмежаванні. Метад “выдаткі-выпуск” сапраўды карысны для ідэнтыфікацыі кластэраў, якія складаюцца з ланцугоў вартасці “пакупнік-прадавец” (*buyer-supplier value chains*) і ўключаюць канцавых рынкавых вытворцаў і пастаўшчыкоў першага, другога, трэцяга і г. д. шэрагу, што прама і ўскосна ўдзельнічаюць у гандлі. Аналагічнае абмежаванне мае метад графаў. У той жа час паказальнік размяшчэння дае мала інфармацыі пра неад’емныя характарыстыкі кластэраў. Больш за тое, даследаванне, якое грунтуецца выключна на паказальніку размяшчэння з’яўляюцца недакладным для вывучэння кластэраў, паколькі не раскрывае ўзаемазалежнасцяў паміж прадпрыемствамі і сектарамі.

Што датычыць RCA-індэксу, то ён карысны толькі ў некаторых абставінах, паколькі неабходныя для яго разліку дадзеныя часта даступныя толькі на нацыянальным, а не рэгіянальным узроўні. Тым часам, даследаванне выпадкаў забяспечвае глыбокае пранікненне ў механізмы, якія садзейнічаюць стварэнню кластэраў і выкарыстоўваемых метадаў вытворчасці. Аднак пры гэтым не хапае колькаснай інфармацыі пра важнасць і эканамічную ролю кластэраў.

На дадзены момант агульнапрынятага падыходу для выяўлення і аналізу галіновых кластэраў, як і матэматычнага апарату па ацэнцы канцэнтрацыі відаў дзейнасці ў некаторым месцы, не існуе [14, с. 18-22]. У залежнасці ад гэтых фактараў прымяняецца падыход, заснаваны галоўным чынам на статыстычных даных (метад выдаткі-выпуск (input-output), паказальнік размяшчэння (location quotient)) або на якасных дадзеных (даследаванне прыкладаў (case studies) шляхам інтэрв’ю або анкетнага апытання) [14].

У табліцы 8 прыводзяцца вышэйпералічаныя метады кластэрнага аналізу і коратка даюцца іх асноўныя перавагі і недахопы.

Табліца 8 – Магчымыя метады кластэрнага аналізу

Метад	Перавагі	Недахопы
Экспертная ацэнка	Адносна эфектыўны па выдатках і часе даследавання метад. Забяспечвае змястоўную інфармацыю	Нельга зрабіць абагульненні. Цяжка добра арганізаваць сістэматычны збор даных
Індыкатар спецыялізацыі (паказальнік размяшчэння)	Непрацаёмісты, недарагі. Можа дапаўняць іншыя метады	У цэнтры ўвагі не канкрэтныя кластэры, а сектары (галіны) вытворчасці
Паказальнік выяўленых канкурэнтных пераваг (RCA-індэкс)	Забяспечвае міжнароднае супастаўленне	Недахоп даных на рэгіянальным узроўні. Акцэнтуе ўвагу на экспартных сектарах
Выдаткі-выпуск: гандаль	Часта з'яўляецца адзінай крыніцай дадзеных пра ўзаемазалежнасць сектараў вытворчасці. Дэталізаваны і матэматызаваны метад	Можа адставаць па часе. Недасканаласць вылучэння галінаў. Недахоп статыстычных даных. Не ўлічвае сувязі з невытворчым сектарам (інстытутамі)
Выдаткі-выпуск: інавацыі	Ключавы паказальнік ўзаемазалежнасці	Адсутнасць статыстычных даных (у т.л. у ЗША)
Тэорыя графаў/ сецявы аналіз	Візуалізацыя спрыяе лепшай інтэрпрэтацыі і аналізу	Метады і праграмнае забеспячэнне абмежаваныя
Апытанні	Гнуткасць у зборы неабходных (якасных) даных. Хуткасць	Значныя выдаткі. Неадназначнасць вынікаў і цяжкасці ў іх выкарыстанні

Крыніца: Распрацавана аўтарам на аснове [14].

На нашу думку даследаванне галіновых кластэраў павінна праводзіцца з выкарыстаннем камбінацыі пералічаных метадалагічных падыходаў. Згодна з праведзеным параўнаўчым аналізам існуюць падставы лічыць, што аптымальным

падыходам для выяўлення галіновых кластэраў з'яўляецца методыка, заснаваная на выкарыстанні паказальніку размяшчэння і вынікаў анкетнага апытання прадпрыемстваў, якія ўтвараюць кластэр.

Атрыманых колькасных даных недастаткова для якаснай характарыстыкі патэнцыяльных кластэраў. Адзінай крыніцай такой інфармацыі можа быць непасрэднае вывучэнне прадпрыемства, што аднак з'яўляецца працаёмістай працэдурай. З пункту гледжання выдаткаў часу на даследаванне больш мэтазгодна праводзіць анкетнае апытанне.

2.3 Распрацоўка анкеты для вызначэння характарыстык кластэраў і ўтвараючых іх сувязяў

Для высвятлення якасных характарыстык кластэраў і сувязяў, якія іх падтрымліваюць, была распрацавана анкета. Апрацоўка анкеты павінна дазволіць вызначыць характарыстыкі патэнцыяльных кластэраў, ацаніць інтэнсіўнасць і важнасць для інавацыйнага развіцця прадпрыемстваў сацыяльна-эканамічных сувязяў, якія існуюць паміж імі і дзяржаўнымі і даследчыцкімі ўстановамі, дзяржаўнымі і прыватнымі інстытутамі і іншымі суб'ектамі эканомікі і грамадскімі інстытутамі.

У анкетах ставіцца задача высветліць шэраг індыкатараў існавання або неіснавання паводзінаў і рысаў прадпрыемстваў, якія адпавядаюць асяроддзю кластэраў.

Пад увагу бяруцца наступныя крытэры:

1) эфектыўнасць,

2) інавацыйнасць,

3) рэгіянальныя гандлёвыя сувязі (трансакцыі),

4) інтэрнацыяналізацыя (велічыня замежнага капіталу),

5) супрацоўніцтва паміж прадпрыемствамі,

6) супрацоўніцтва сферай даследаванняў (ДР),

7) інстытуцыяналізацыя супрацоўніцтва паміж фірмамі (фармальнае афармленне)

8) супрацоўніцтва з сектарам паслугаў, заснаваных на ведах (кансультацыі, павышэнне кваліфікацыі),

9) удзел у прадпрымальніцкіх арганізацыях, галіновых саюзах,

10) узаемадзеянне з мясцовымі ўладамі,

11) адукаванасць персаналу і яго колькасць.

Анкета складаецца з 30 групаў пытанняў, на якія неабходна адказаць кіраўніцкаму персаналу прадпрыемства. Асобныя пытанні ўтрымліваюць варыянты адказаў, якія

неабходна пазначыць, іншыя патрабуюць дакладных адказаў. Групы пытанняў пералічаны ніжэй.

В1. Калі ласка, ахарактарызуйце прадпрыемства па наступных параметрах:

В1_1. Год узнікнення прадпрыемства.

В1_2. Спосаб прыватызацыі прадпрыемства.

В1_3. Прадпрыемства з'яўляецца даччыным.

В1_4. Доля дзяржаўнай уласнасці.

В1_5. Доля замежнай уласнасці.

В2. Калі ласка, апішыце, якія змены адбыліся ў наступных параметрах прадпрыемства ў 2004 г.?

В3. Калі ласка, адзначце, ці мае прадпрыемства (яго прадукцыя) наступныя характарыстыкі?

В4. Ці асвоіла прадпрыемства на працягу апошніх 3 гадоў выпуск новай або значна ўдасканаленай прадукцыі?

В5. Якія характарыстыкі новай прадукцыі?

В6. Які адсотак прыбытку ў 2004 г. і ў 1 квартале 2005 г. прыходзіўся на новую прадукцыю?

В7. Чаго дакраналіся ўдасканаленні?

В8. Калі ласка, ацэніце сілу канкурэнцыі на рынку асноўнай прадукцыі прадпрыемства.

В9. Крыніцай канкурэнцыі для прадпрыемства з'яўляюцца ў асноўным:

В10. Ахарактарызуйце структуру продажаў і закупаў прадпрыемства на наступных рынках.

В11. Калі ласка, адзначце 3 асноўных фактару, якія абумовілі выбар месцазнаходжання прадпрыемства:

В12. Калі ласка, адзначце, у якіх сферах прадпрыемства супрацоўнічае з іншымі прадпрыемствамі галіны.

В13. Калі прадпрыемства цесна супрацоўнічае з іншымі прадпрыемствамі, то якая арганізацыйная форма гэтага супрацоўніцтва.

В14. Калі ласка, адзначце найважныя перавагі, атрыманыя прадпрыемствам у выніку супрацоўніцтва з іншымі прадпрыемствамі.

В15. Калі ласка, вызначыце 3 асноўных перашкоды для супрацоўніцтва з прадпрыемствамі.

В16. Калі ласка, вызначыце 3-х асноўных пастаўшчыкоў і спажыўцоў Вашай прадукцыі?

В17. Які ўплыў на прадпрыемства аказалі адносіны з пастаўшчыкамі?

В18. Які ўплыў на прадпрыемства аказалі адносіны з спажыўцамі?

В19. Як часта прадпрыемства супрацоўнічае з навукова-даследчымі арганізацыямі?

В20. Калі ласка, адзначце найважныя перавагі, атрыманыя прадпрыемствам у выніку супрацоўніцтва з навуковымі установамі.

В21. Калі ласка, вылучыце 3 найважныя чыннікі адсутнасці або абмежаванасці супрацоўніцтва з навуковымі установамі.

В22. Ці карыстаецца прадпрыемства паслугамі наступных тыпаў фірм/устаноў?

В23. Ці з'яўляецца прадпрыемства чальцом які-небудзь асацыяцыі, саюза, галіновага аб'яднання, канцэрна?

В24. Якія выгоды мае прадпрыемствы ад удзелу ў асацыяцыі, саюзе, галіновым аб'яднанні, канцэрне?

В25. Якія адносіны мае з мясцовымі (рэгіянальнымі) органамі ўлады?

В26. Як часта супрацоўнікі прадпрыемства ўдзельнічаюць у наступных мерапрыемствах?

В27. Якая частка супрацоўнікаў прадпрыемства на канец 2004 г. мае адукацыю?

В28. Калі ласка ахарактарызуйце наступныя паказчыкі прадпрыемства: выручка ад рэалізацыі, выручка ад экспарту, рэнтабельнасць прадукцыі, выдаткі на імпарт, інвестыцыі ў машыны і абсталяванне, выдаткі на даследаванні і распрацоўкі, колькасць працаўнікоў, колькасць ІТР.

В29. У выпадку павелічэння эфектыўнасці сувязяў прадпрыемства да жаданага ўзроўня, на колькі адсоткаў магла бы выгадуй рэнтабельнасць вытворчасці?

В30. Поўны назоў і адрас прадпрыемства, пасада запоўніўшага анкету.

Поўны тэкст анкеты прыведзены ў дадатку А.

2.4 Методыка вызначэння месцазнаходжання і характарыстык прамысловых кластэраў

Фактычна прыведзеныя вышэй развагі і аналіз магчымых метадаў, якія могуць быць выкарыстаны для выяўлення кластэраў, ужо даюць уяўленне аб прапануемай методыцы вызначэння месцазнаходжання і характарыстык прамысловых кластэраў.

Дадзеную методыку можна прадставіць у выглядзе наступнай паслядоўнасці асноўных этапаў працэсу выяўлення кластэраў.

Табліца 9 – Этапы вызначэння месцазнаходжання і характарыстык прамысловых кластэраў

Нумар этапу	Апісанне этапу
1	Выкарыстанне паказальніку размяшчэння для выяўлення канцэнтрацыяў асобнай галіны (віду дзейнасці) у рэгіянальным разрэзе. Найбольш дробнай тэрытарыяльнай адзінкі, па якой збіраюцца статыстычныя даныя па прамысловасці ў Беларусі, з'яўлецца адміністратыўны раён (усяго іх 118) і буйнейшыя гарады (19), да якіх адносіцца і г. Мінск. Даследаванне канцэнтрацыі галінаў прамысловасці на цяперашнім этапе магчыма толькі ў разрэзе 10 галінаў прамысловасці. У Беларусі распрацавана Агульнагаліновая класіфікацыя эканамічнай дзейнасці (АКЭД), аднак даныя ў рэгіянальным разрэзе па гэтай класіфікацыі недаступныя.
2	Пабудова геаграфічных макетаў адміністратыўнага падзелу з вылучэннем адміністратыўных раёнаў і буйных гарадоў з мэтай візуалізацыі разлічаных паказальнікаў канцэнтрацыі. Візуалізацыя разлічаных паказальнікаў канцэнтрацыі робіцца з дамамогай геаінфармацыйнага праграмнага забеспячэння. Пры правядзенні даследавання ў Беларусі мы карысталіся сістэмай тэматычнай апрацоўкі картаў **MapViewer кампаніі Golden Software Inc (ЗША) версіі 4.01 ад 2.07.2001 г.** Выгляд праграмы прадстаўлены ў Дадатку Б. Праграмнае забеспячэнне перададзена ў карыстанне польскім бокам.
3	На дадзеным этапе праводзіцца ідэнтыфікацыя геаграфічных абшараў, дзе, у адпаведнасці з прынятымі крытэрамі, найбольш верагодна існаванне кластэраў. Пры выбары такіх рэгіёнаў выкарыстаны два крытэры, па-першае, сіла канцэнтрацыі, вызначаная праз паказальнік размяшчэння, і, па-другое, наяўнасць канцэнтрацыі сумежных відаў дзейнасці, якія прадстаўляюць частку вертыкальнага або гарызантальнага ланцужка вытворчасці. Напрыклад, для вытворчасці мэблі, гэта забеспячэнне пілапрадукцыяй або круглым лесам, плітнымі матэрыяламі і г.д.
4	Для выстватлення, ці існуюць у вылучаных канцэнтрацыяў у канкрэтнай галіне характарыстыкі кластэраў, на прадпрыемствы, якія ў іх уваходзяць разсылаюцца анкеты. Паралельна ўсім папярэднім этапам вядзецца збор інфармацыі пра аналізуемыя сектары, вывучаюцца канкрэтныя выпадкі (case studies).

Табліца 9

Нумар этапу	Апісанне этапу
5	На апошнім этапе праводзіцца поўная апрацоўка атрыманых даных, праводзіцца іх якасны і статыстычны (рэгрэсійны) аналіз і на аснове гэтага распрацоўваюцца пэўныя рэкамендацыі для рэгіянальных і цэнтральных уладаў, галіновых ведамстваў і канцэрнаў.

Спынімся больш падрабязна на першым этапе. Як адзначалася вышэй, з паказальнікаў лакалізацыйнага аналізу для мэтаў вылучэння кластэраў у большай ступені адпавядае паказальнік размяшчэння [5, с. 7-30], разгледжаны вышэй. Для выяўлення кластэраў у прамысловым сектары эканомікі варта карыстацца паказальнікам размяшчэння, вызначаным як суадносіну долі занятых у галіне прамысловасці *i* ў агульнай колькасці занятых у прамысловасці рэгіёну *r* да долі занятых гэтай жа галіны прамысловасці *i* ў агульнай колькасці занятых у прамысловасці краіны.

Гэтую форму паказальніку размяшчэння прамысловасці можна адлюстраваць наступным чынам:

$$ILq_{ir} = d_{ir} / d_i \qquad (4)$$

дзе $ILq_{ir\ i}$ – паказальнік размяшчэння галіны прамысловасці *i* па занятасці (колькасці прадпрыемстваў, выпуску) у рэгіёне *r*;

d_{ir} – удзельная вага занятых (колькасці прадпрыемстваў, выпуску) галіны прамысловасці *i* ў агульнай колькасці занятых (колькасці прадпрыемстваў, выпуску) у прамысловасці рэгіёну *r*;

d_i – удзельная вага занятых (колькасці прадпрыемстваў, выпуску) галіны прамысловасці *i* ў агульнай колькасці занятых (колькасці прадпрыемстваў, выпуску) у прамысловасці краіны ў цэлым.

Як адзначалася вышэй, калі паказальнік $Lq>1$, значыць, галіна прамысловасці прадстаўлена ў канкрэтным рэгіёне ў большай ступені, чым па прамысловасці краіны ў цэлым. Адпаведна, калі паказальнік размяшчэння $Lq\leq1$, то канкрэтная галіна ў рэгіёне не паказвае больш высокай канцэнтрацыі, чым у сярэднім па прамысловасці краіны. Звычайна, велічыня паказальніку размяшчэння, якая **перавышае 1,25**, лічыцца доказам наяўнасці спецыялізацыі некаторага рэгіёну ў дадзеным сектары [5, с. 26].

Як адзначалася, паказальнік размяшчэння, каб пазбегнуць памылковых высноваў, трэба выкарыстоўваць уважліва, дадаваць да колькаснага аналізу пэўныя якасныя даныя, якія пацвярджаюць колькасныя вынікі.

Для ўдасканалення методыкі, заснаванай на паказальніку размяшчэння, вырашана супаставіць ацэнкі паказальніка размяшчэння для сектараў спецыялізацыі рэгіёна з іх параўнальнай эфектыўнасцю і яе дынамікай у межах рэгіёна. Для гэтага скарыстаем распрацаваны намі індэкс структурна-фактарнай эфектыўнасці (ІСФЭ) [42]:

$$e_i = \left(\frac{d_i^Y}{d_i^L} \cdot \alpha_i^* + \frac{d_i^Y}{d_i^F} \cdot (1 - \alpha_i^*) \right) \cdot 100, \quad (5)$$

дзе e_i – індэкс структурна-фактарнай эфектыўнасці галіны *i*;

d_i^Y – удзельная вага галіны *i* ў структуры выпуску прамысловасці;

d_i^L – удзельная вага галіны *i* ў структуры працоўных рэсурсаў прамысловасці;

d_i^F – удзельная вага галіны *i* ў структуры асноўнага капіталу прамысловасці;

α_i^* – нармаваны паказчык эластычнасці выпуску па працоўных рэсурсах;

$(1 - \alpha_i^*)$ – нармаваны паказчык эластычнасці выпуску па асноўнаму капіталу.

Пазітыўная дынаміка ІСФЭ (яго рост або ўстойлівае знаходжанне на ўзроўні вышэй за сярэдні па прамысловасці) пацвярджае наяўнасць у некаторым рэгіёне перавагаў па прадукцыйнасці для вызначанага сектара.

Што датычыць чацвёртага этапу і непасрэдна апрацоўкі даных анкетавання, то пасля рассылкі анкеты па пошце або непасрэднага інтэрв'юіравання і атрымання вынікаў анкетавання прапаноўваецца наступны алгарытм апрацоўкі рэзультатаў:

- Ствараецца электронны файл, дзе па вертыкалі змяшчаюцца пытанні анкеты і варыянты адказу на іх, а па гарызанталі – назвы прадпрыемстваў. Прадпрыемствы групуюцца па геаграфічнай і галіновай прыкмеце.
- Ячэйкі насупраць кожнага пытання запаўняюцца закадаваным нумарам варыянту адказу на пытанне (прысвойванне кодавага нумару пытанням робіцца папярэдне).
- Апошні вертыкальны слупок утрымлівае разлік сярэдняга працэнту станоўчага адказу на кожнае пытанне. Па кожнаму блоку пытанняў і адказаў ствараюцца дыяграмы, якія графічна ілюструюць размеркаванне і ўдзельную вагу асобных адказаў на пытанне.

- Робіцца інтэрпрэтацыя атрыманых вынікаў даследавання і ацэньваюцца зробленыя на папярэдніх этапах даследавання гіпотэзы.
- На аснове пацвярджэння або абвяржэння зробленых гіпотэзаў з улікам вынікаў зробленых разлікаў паказчыкаў канцэнтрацыі, аналізу замежнага вопыту (у першую чаргу польскага) распрацоўваюцца рэкамендацыі па ўдасканаленню навукова-тэхнічнай і прамысловай палітыкі.

У нашым канкрэтным выпадку праводзілася анкетаванне прадпрыемстваў лесапрамысловага комплексу Беларусі, большасць з якіх падначчаленыя канцэрну «Беллеспаперпрам».

З мэтай уліку фактару размяшчэння прадпрыемстваў створаны макеты геаграфічных картаў Беларусі для адлюстравання сувязяў у кластэрах у графічным выглядзе.

3 Выяўленне галіновых кластэраў у Беларусі і Польшчы

3.1 Галіновыя кластэры ў Польшчы

Даследаванні, звязаныя з кластэрамі і блізкімі да іх канцэпцыямі, у Польшчы пачаліся з канца 80-х гг. У 2002 г. Інстытут даследаванняў рынкавай эканомікі пачаў праект Камітэта навуковых даследаванняў па выяўленню патэнцыялу і магчымасцяў развіцця кластэрных структураў у польскай эканоміцы.

Былі выяўлены наступныя канцэнтрацыі эканамічнай дзейнасці па галінах: рыбная прамысловасць, спажывецкая прамысловасць, прамысловасць па вытворчасці адзення, скураная прамысловасць, біятэхналагічна-фармацэўтычна-касметалагічная прамысловасць, мэблевая прамысловасць, прамысловасць штучных валокнаў, кластэр электронікі, інфарматыкі і тэлекамунікацыі, будаўніцтва.

Даследаванні кластэраў у Польшчы больш забяспечана статыстычнымі данымі, паколькі статыстыка прамысловасці збіраецца згодна з польскай класіфікацыяй эканамічнай дзейнасці PKD, якая вылучае больш падрабязную структуру відаў эканамічнай актыўнасці [43]. Напрыклад, пры вывучэнні канцэнтрацыі мэблевай прамысловасці ў Польшчы ўлічваліся сувязі гэтага віду дзейнасці з наступнымі групамі PKD (табліца 10).

Табліца 10 – Групы PKD, залічаныя да мэблевага кластэру ў Польшчы

Група PKD	Характарыстыка групы
020	Лясная гаспадарка і паслугі
201	Піламатэрыялы, струганая драўніна
202	Вытворчасць гнутаклееных вырабаў, фанеры, ламінаваных і іншых пліт
203	Вытворчасць канструкцыйных драўляных элементаў і будаўнічых сталярных вырабаў
204	Вытворчасць драўлянай тары
205	Вытворчасць іншых вырабаў з драўніны з кары, саломы і інш.
361	Вытворчасць мэблі

На аснове статыстычнага аналізу мэблевага кластэру на ўзроўні паветаў паказана, што лакалізацыя прадпрыемстваў мэблевага сектара з’яўляецца дадатна і статыстычна істотна срарэлявана з лакалізацыяй прадпрыемства, якія ўключаюцца ў групы PKD, пералічаныя ў табліцы. Належыць адзначыць, што мэблевы сектар звязаны як з відамі

дзейнасці па здабычы сыравіны, так і з галінамі гарызантальна звязанымі з перапрацоўкай драўніны.

На аснове колькасці ідэнтыфікаваных канцэнтрацыяў мэблевага сектару (PKD 361) на ўзроўні паветаў (да значных канцэнтрацыяў аднесены паветы, дзе паказчык размяшчэння, разлічаны па колькасці занятых, перавышаў 1,25) выяўлена выразная дамінацыя наступных ваяводстваў: Велькапольскае, Вармінска-Мазурскае, Куяўска-Паморскае і Паморскае (табліца 11). На ўзроўні паветаў паказчык размяшчэння найвышэйшую велічыню меў у Кемпенскім павеце (Велькапольскае ваяводства), Хеўменскім павеце (Куяўска-Паморкае ваяводства), а таксама Алесніцкім павеце (Дольнаслёнскае ваяводства).

Табліца 11 – Рэйтынг польскіх ваяводстваў па колькасці канцэнтрацыяў мэблевай прамысловасці на ўзроўні паветаў (Lq ≥ 1,25)

№	Ваяводства	Колькасць канцэнтрацыяў
1	Велькапольскае	17
2	Вармінска-Мазурскае	9
3	Куяўска-Паморскае	8
4	Паморскае	8
5	Любускае	7
6	Заходнепаморскае	6
7	Дольнаслёнскае	5
8	Любельскае	4
9	Малапольскае	4
10	Апольскае	4
11	Падкарпацкае	3
12	Лодзкае	2
13	Падляскае	2
14	Мазавецкае	0
15	Слёнскае	0
16	Свентакшыскае	0

На аснове размеркавання канцэнтрацыяў мэблевай прамысловасці польскія даследчыкі адзначаюць, што спецыфічнай рысаю лакалізацыі гэтага сектару ў Польшчы з’яўляецца выразная канцэнтрацыя прадпрыемстваў галіны ў поясе, які праходзіць праз ваяводствы Дольнаслёнскае, Любускае, Велькапольскае, Заходнепаморскае, Паморскае, Куяўска-Паморскае і Вармінскае-Мазурскае.

Другая выразная канцэнтрацыя прадпрыемстваў мэблевага сектару лакалізавана на паўднёвым усходзе Польшчы на тэрыторыі Любельскага і Падкарпацкага ваяводства.

Прасторавае размяшчэнне і канцэнтрацыі мэблевай прамысловасці Польшчы, а таксама ўсіх сектраў, звязаных з гэтым відам дзейнасці (гл. табліцу 10), ілюструе малюнак 3. Паказчык размяшчэння разлічаны па колькасці занятых.



Малюнак 3 – Прасторавае размяшчэнне і канцэнтрацыі мэблевай прамысловасці Польшчы

Малюнак 3 паказвае таксама перавагі выкарыстання статыстычных даных па больш дробных класах эканамічнай дзейнасці. У выпадку Беларусі такая магчымасць на дадзены момант адсутнічае.

Галіна штучных валокнаў у Польшчы (табліца 12) не характарызуюцца моцнай канцэнтрацыяй дзейнасці. Аналіз прасторавага размяшчэння прадпрыемстваў сектару сведчыць аб схільнасці да лакалізацыі вытворчасці гэтага віду каля вялікіх агламерацыяў (недалёка ад іншых прамысловых канцэнтрацыяў) у раёне Варшавы, Познані, Катовіцы, Кракава, Вроцлава і Быдгошча.

Табліца 12 – Групы PKD, залічаныя да кластэру штучных валокнаў ў Польшчы

Група PKD	Характарыстыка групы
241	Вытворчасць асноўных хімічных рэчываў
251	Вытворчасць вырабаў з гумы
252	Вытворчасць вырабаў са штучных валокнаў

Для спраўджвання, ці сапраўды ў выяўленых канцэнтрацыях занятасці па сектарах прамысловасці знаходзяцца кластэрныя структуры Інстытутам даследаванняў рынкавай эканомікі праведзена анкетнае даследаванне (апытана 283 фірмы з 9 галінаў прамысловасці). Інтэнсіўнасць кластэрных характарыстык у канцэнтрацыях мэблевай вытворчасці і вытворчасці штучных валокнаў Польшчы прыведзена ў табліцы 13.

Табліца 13 – Інтэнсіўнасць кластэрных характарыстык у мэблевых і хімічных канцэнтрацыях Польшчы

Кластэрная характарыстыка	Канцэнтрацыі вытворчасці мэблі			Канцэнтрацыі вытворчасці штучных валокнаў
	Познань	Алесніца-Кемпно	Ольштын	Велькапольскае
Эфектыўнасць	++	0	+	+
Інавацыйнасць	+	++	0	0
Рэгіянальныя трансакцыі	-	-	0	-
Інтэрнацыяналізацыя	++	++	0	++
Супрацоўніцтва паміж прадпрыемствамі	-	++	-	-
Супрацоўніцтва са сферай даследаванняў (ДР)	+	0	-	+
Інстытуцыяналізацыя супрацоўніцтва	++	-	+	-
Супрацоўніцтва з паслугамі, заснаванымі на ведах	+	-	0	-
Удзел у арганізацыях прадпрымальнікаў	-	-	-	-
Узаемадзеянне з мясцовымі ўладамі	++	+	-	+
Мабільнасць персаналу	+	-	-	-

Заўвага. У табліцы (+) азначае, што канкрэтны параметр мае больш высокую інтэнсіўнасць, чым сярэдняя, (-) азначае, што канкрэтны параметр мае ніжэйшую інтэнсіўнасць, чым сярэдняя, 0 – што інтэнсіўнасць параметру адпавядае сярэдняй.

Крыніца: Даследаванне Інстытуту даследаванняў рынкавай эканомікі (г. Гданьск).

Можна бачыць, што супрацоўніцтва паміж прадпрыемствамі выступае важнай характарыстыкай згрупавання мэблевых фірмаў у Алесніцы-Кемпно з Велькапольскага ваяводства. Гэта група фірмаў з’яўляецца як і канцэтрацыя вытворчасці мэблі ў Познані інавацыйнай і падтрымлівае моцныя кантакты з замежжам. Супрацоўніцтва паміж фірмамі, адзначанае ў анкетах з Алесніцы-Кемпно, выступае ў асноўным у выглядзе

навучання супрацоўнікаў, сумесных паставак і дыстрыбуцыі, а таксама ўдзелу ў тэндэрах. Абодзве названых групоўкі прадпрыемстваў падтрымліваюць істотныя кантакты з мясцовымі ўладамі. Хоць супрацоўніцтва паміж фірмамі ў Познані слабае, але тыя фірмы, якія супрацоўнічаюць, валодаюць адпаведнай інфраструктурай і часта карыстаюцца паслугамі, заснаванымі на ведах (кансультацыях, даследаваннях і г.д.).

З другога боку значная канцэнтрацыя фірмаў у Ольштыне хоць і мае эфектыўнасць дзейнасці вышэй за сярэднюю па галіне, але не зусім не абапіраецца на супрацоўніцтва паміж суседнімі прадпрыемствамі і з замежнымі партнёрамі.

Трэба адзначыць, што 13,5% апытаных фірм маюць у структуры актываў долю замежнага капіталу, і на іх занята 24% працаўнікоў фірмаў з усёй выбаркі. Даследаванне паказала, што з усіх выяўленых канцэнтрацыяў найбольшая колькасць прадпрыемстваў па вытворчасці штучных валокнаў з замежным удзелам была ў Познані – 33% фірмаў.

Важна адзначыць, што хімічны сектар паказвае сталыя адносіны з мясцовымі ўладамі, а таксама супрацоўніцтва са сферай даследаванняў і распрацовак, што можна было чакаць, улічваючы навукаёмісты характар галіны.

Агульнай рысай для канцэнтрацый і мэблевай і хімічнай вытворчасці з’яўляецца адсутнасць удзелу ў арганізацыях прадпрымальнікаў, а таксама невысокая мабільнасць персаналу.

У цэлым, як паказала даследаванне, выяўленыя тэрытарыяльныя канцэнтрацыі відаў дзейнасці не валодаюць усімі характарыстыкамі кластэраў, або маюць іх на некаторым сярэднім узроўні. Таму польскія даследчыкі з асцярожнасцю ўжываюць тэрмін «кластэр» у адносінах да выяўленых канцэнтрацыяў прадпрыемстваў і часцей называюць іх «канцэнтрацыяй фірмаў», «згрупаваннем» або «згушчэннем» [43].

Тым не менш, праведзены статыстычны аналіз паказаў, што схільнасць да супрацоўніцтва статыстычна значна і пазітыўна залежыць ад велічыні фірмаў – большыя прадпрыемствы больш схільныя да ўзаемадзеяння, а таксама ад узроўню адукаванасці персаналу фірмаў. Асноўны вынік рэгрэсійнага аналізу сведчыць пра тое, што падтрымка ўзаемадзеянняў фірмаў з іх асяроддзем павялічвае шансы на ўкараненне інавацый, якія ў сваю чаргу пазітыўна ўплываюць на рэнтабельнасць і долю рынку, якую займае прадпрыемства [43, с. 52].

3.2 Выяўленне галіновых канцэнтрацыяў у Беларусі

Выяўленне галіновых кластэраў у Беларусі праводзілася на прыкладзе лясной і хімічнай прамысловасці (табліца 14). Прычым, статыстыка прамысловасці вылучае

ўцэлым лясную, дрэваапрацоўчую і цэлюлозна-папяровую прамысловасць (ЛДППП) і хімічную і нафтахімічную прамысловасць (ХНП) і не прадстаўляе даных у больш дэталёвым разрэзе.

Табліца 14 – Колькасць прадпрыемстваў, аб'ём выпуску прадукцыі і занятасць у ЛДЦПП і ХНП (прадпрыемствы на самастойным балансе і малыя прадпрыемствы), 2004 г.

Галіна	Колькасць прадпрыемстваў			Аб'ём прадукцыі, млн. руб.			Сярэднегадавая колькасць персаналу, тыс. чал.		
	ПСБ	МП	Усяго	ПСБ	МП	Усяго[1]	ПСБ	МП	Усяго
Прамысловасць	2 271	7 450	9 721	44 944,1	3 585,9	48 530	1 057,0	156,6	1 213,6
ЛДЦПП	324	1 245	1 569	1 883,6	470,6	2 468	123,0	24,8	147,8
Доля ЛДЦПП у прамысловасці, %	14,3	16,7	**16,1**	4,2	13,1	**5,1**	11,6	15,9	**12,2**
ХНП	79	456	535	4 949,8	472,2	5 472	101,0	9,6	110,6
Доля ХНП у прамысловасці, %	3,5	6,1	**5,5**	11,0	13,2	**11,3**	9,6	6,1	**9,1**

1. Аб'ём прадукцыі (у фактычных цэнах). Прыводзіцца згодна са статыстычнымі данымі як зводны выпуск прамысловасці і яе галінаў. У зводныя даныя па аб'ёму прамысловай прадукцыі ўключаюцца даныя па аб'ёму прамысловай прадукцыі (работ, паслуг), якая выпускаецца прадпрыемствамі на самастойным балансе (буйныя і сярэднія), сумеснымі і малымі прадпрыемствамі, а таксама падсобнымі вытворчасцямі на балансе непрамысловых прадпрыемстваў [44, с. 338, 368, 375].

Групы прадпрыемстваў лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці (ЛДППП) прадстаўлены ў табліцы 15, якая адлюстроўвае выпуск прамысловай прадукцыі і занятасць у разрэзе ЛДЦПП, у тым ліку канцэрна "Беллеспаперпрам", малых прадпрыемстваў і падсобных вытворчасцяў на балансе непрамысловых прадпрыемстваў. Як сведчаць даныя табліцы 15, у ЛДЦПП занята звыш 155 тыс. чалавек, што складае 3,6% занятых у эканоміцы ў 2004 г. (4335 тыс. чалавек). Акрамя гэтага на прадпрыемствах Міністэрства лясной гаспадаркі працуе звыш 39 тыс. чалавек, больш 3 тыс. чалавек занята ў лясным комплексе ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў.

Такім чынам, непасрэдна ў лясным комплексе занята звыш 198 тыс. чалавек, або 4,6% занятых у эканоміцы. З улікам таго, што галіна дае месцы працы ў сферы гандлю, будаўніцтва і іншых галінах, па самых сціплых ацэнках лясны комплекс забяспечвае каля 250 тыс. месца працы, што складае 5,8% занятых у эканоміцы Беларусі ва ўмовах 2004 г.

Табліца 15 – Групы прадпрыемстваў лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці і іх асноўныя характарыстыкі па выніках 2004 г.

Група прадпрыемстваў	Колькасць прадпрыемстваў	Выпуск прадукцыі, млн. руб.	Удзельная вага ў выпуску, %	Колькасць занятых, тыс. чал.	Удзельная вага ў занятасці, %
Прадпрыемствы ЛДЦПП на самастойным балансе	324	1883,6	76,3	123,0	79,1
у т.л. прадпрыемствы канцэрна "Беллеспаперпрам"	*52*	*1052,6*	*42,6*	*48,6*	*31,2*
Малыя прадпрыемствы	1245	470,6	19,1	24,8	15,9
Падсобныя вытворчасці на балансе непрамысловых прадпрыемстваў	1132	113,8	4,6	7,8	5,0
Усяго ў ЛДЦПП	2701	2468	100	155,6	100

Ва ўнутрыгаліновай структуры лесапрамысловага комплексу пераважае дрэваапрацоўчая прамысловасць (69,5% агульнага аб'ёму прадукцыі), цэлюлозна-папяровая (18,6%). Дзель лесанарыхтоўчай прамысловасці складае 10,5%. У структуры дрэваапрацоўчай прамысловасці ключавую ролю гуляе мэблевую вытворчасць - 62,3% аб'ёму выпуску. Развітыя таксама вытворчасць будаўнічых дэталяў з драўніны і пліт на дрэўнай аснове (24%), лесапільнае (6,6%) і запалкавае (2,2%) вытворчасць.

Вытворчы патэнцыял лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці Беларусі дазваляе не толькі задавальняць патрэбнасці ўнутранага рынку ў большасці выглядаў яе прадукцыі, але і значную частку яе (50-60%) экспартаваць. У 2004 г. яна пастаўлялася ў 56 краін свету 5 кантынентаў.

Важнасць лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці вызначаецца яшчэ і тым фактам, што гэтая галіна з’яўляецца асноўным месцам працы ў гарадах, раённых цэнтрах і сельскіх раёнах Беларусі, што адлюстроўвае размяшчэнне дадзенай галіны.

Размяшчэнне ЛДЦПП і ХНП аналізавалася на аснове даных, прадстаўленых на платнай аснове абласнымі статыстычнымі ўпраўленнямі ў разрэзе прадпрыемстваў на самастойным балансе і малых прадпрыемстваў па 118 раёнах і 19 буйных гарадах Беларусі (Дадатак В). Перш чым прыступіць да выяўленя канцэнтрацыі ЛДЦПП у цэлым, прааналізуем размяшчэнне прадпрыемстваў канцэрну «Беллеспаперпрам».

Выпуск прадукцыі і занятасць на прадпрыемствах канцэрна «Беллеспаперпрам», а таксама структура выпуску і занятасці па абласцях у разрэзе лесанарыхтоўчых, дрэваапрацоўчых, цэлюлозна-папяровых і рамонтна-механічных прадпрыемстваў па выніках 2004 г. прыведзены ў табліцах Г.1 і Г.2 дадатку Г. На малюнках 4 і 5 прыведзена канцэнтрацыя выпуску і занятасці прадпрыемстваў канцэрну «Беллеспаперпрам» па рэгіёнах Беларусі ў 2004 г. (прадпрыемствы гарадоў аднесены да раёнаў).

Аналіз канцэнтрацыі прадпрыемстваў канцэрну, якія ў 2004 г. выпусцілі 42,6% прадукцыі галіны і далі месцы працы 31,2% зянятых у ЛДЦПП Беларусі, па выпуску і колькасці працоўных, паказвае, што папярэдне можна вылучыць як мінімум тры відавочных згрупаванні прадпрыемстваў галіны (гл. табліцу Г.2 і малюнкі 4, 5).



Малюнак 4 – Канцэнтрацыя выпуску прадпрыемстваў канцэрну «Беллеспаперпрам» па рэгіёнах Беларусі



Малюнак 5 – Канцэнтрацыя занятасці на прадпрыемствах канцэрну «Беллеспаперпрам» па рэгіёнах Беларусі

Па-першае, гэта Бабруйска-Гомельская канцэнтрацыя (прадпрыемствы Бабаруйску, Светлагорску, Рэчыцы, Гомеля і Добрушу), якая мае ў асноўным цэлюлозна-папяровую спецыялізацыю. Па-другое, яўна вылучаецца Пінска-Мастоўская канцэнтрацыя (прадпрыемствы Пінску, Івацэвіч, Лунінца, ў непасрэднай блізказці да якіх знаходзяцца прадпрыемствы Слоніму і Мастоў). Па-трэцяе, існуе Барысаўска-Маладзечанскае згушчэнне (прадпрыемствы Барысава, Маладзечна, Мінску, Вілейкі, да якіх можна далучыць прадпрыемствы Слуцкага, Клецкага, Лагойскага, Чэрвеньскага і Пухавіцкага раёнаў).

На аснове даных дадатку В разлічаны паказальнікі размяшчэння для ЛДЦПП і ХНП Беларусі (дадатак Д). На аснове даных табліцы Д.1 пабудаваны карты размяшчэння дадзеных галінаў. Так, на малюнку 6 прыведзена канцэнтрацыя занятасці на прадпрыемствах ЛДЦПП па 137 адміністратыўных адзінках Беларусі. Параўнанне канцэнтрацыі усіх прадпрыемстваў ЛДЦПП і прысутнасці ў рэгіёнах як правіла большых па маштабах прадпрыемстваў канцэрна (малюнкі 4, 5) сведчыць пра тое, што лесапрамысловы комплекс у значнай ступені складаецца з сярэдніх і малых

прадпрыемстваў. Значэнне паказальніку размяшчэння для 74 рэгіёнаў паказвае, што ЛДЦПП з'яўляецца важнаю галіной эканомікі многіх раёнаў і гарадоў Беларусі (Lq ≥ 1,25).



Малюнак 6 – Канцэнтрацыя занятасці на прадпрыемствах ЛДЦПП па рэгіёнах Беларусі



Малюнак 7 – Канцэнтрацыя выпуску прадпрыемстваў ЛДЦПП па рэгіёнах Беларусі

Прааналізуем асобныя канцэнтрацыі сектару ЛДЦПП, якія прадстаўлены на малюнках 6 і 7. Напрыклад, найвялікшы паказальнік размяшчэння мае Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці (Lq = 19,4). Гэта азначае, што калі у сярэднім па краіне доля ЛДЦПП у выпуску прамысловасці складае 5,1%, то ў гэтым рэгіёне ў 19,4 разы больш (98,5%). Іншых прамысловых прадпрыемстваў у раёне няма, ёсць прамысловыя вытворчасці на прадпрыемствах непрамысловых галінаў, дзе, як мы бачым, выпускаецца ўсяго 1,5% прамысловай прадукцыі. Аднак маштаб сектару ЛДЦПП у Краснапольскім раёне даволі сціплы – маецца толькі тры прадпрыемствы, з іх два малых, на якіх у 2004 г. было занята 117 чалавек і выпушчана прадукцыі на 1435 млн. руб. Паказальнік размяшчэння па занятасці роўны 6,7. Пры сярэдняй па краіне долі ЛДЦПП у занятасці прамысловасці складае 12,2%, у Краснапольскім раёне яна складае 81,2%.

Возьмем, напрыклад, для параўнання Івацэвічскі раён Брэсцкай вобласці, які мае адзін з самых вялікіх паказальнікаў размяшчэння – 14,9 па выпуску і 5,6 па занятасці. Тут сектар складаюць ужо 20 прадпрыемстваў (з іх 11 малых), якія ў 2004 г. выпусцілі прадукцыі на 51,7 млрд. руб. (75,6 % выпуску прамысловай прадукцыі горада і раёна) і далі месца працы 2925 чалавекам (68,1% занятасці па прамысловасці).

Такім чынам, пры аналізе канцэнтрацыі разам з паказальнікам размяшчэння належыць улічваць як маштаб галіны, так і колькасць прадпрыемстваў, якія яе складаюць.

Больш ясную карціну дае сумесны аналіз канцэнтрацыі па выпуску або занятасці і колькасці прадпрыемстваў. Гэта відавочна, паколькі кластэрныя структуры ўтвараюцца толькі ў выніку супрацоўніцтва, якое адбываецццца паміж прадпрыемствамі. Як сведчыць малюнак 8, найбольшая канцэнтрацыя прадпрыемстваў і занятасці ў ЛДЦПП назіраецца на Захадзе Беларусі (найбольш выцлучаюцца Івацэвічскі, Баранавічскі і Мастоўскі раёны, г. Пінск, а таксама Кобрынскі і Брэсцкі раёны), і ў яе цэнтральнай частцы (асабліва шмат прадпрыемстваў ЛДЦПП у Мінскім раёне, а таксама Лагойскім, Смалявічскім, Маладзечанскім, Барысаўскім, Уздзенскім і Дзяржынскім раёнах). Адпаведна больш высокай там назіраецца і канцэнтрацыя занятасці і выпуску.

На поўдні па шчыльнасці размяшчэння прадпрыемстваў вылучаюцца Гомель (88) і Гомельскі раён, а таксама Светлагорскі, Брагінскі і Жлобінскі раёны. Можна бачыць, што ў Гомельскай вобласці прадпрыемствы ЛДЦПП размешчаны больш раўнамерна.

Паколькі сувязі і абмен ведамі паміж прадпрыемствамі магчымы толькі праз людзей, якія захоўваюць, развіваюць і перадаюць веды, пра пэўныя кластэрныя рысы можа сведчыць і маштаб занятасці. Карысным у ацэнцы гэтага фактару можа быць малюнак 9, дзе прадстаўлена канцэнтрацыя выпуску і колькасць занятых у ЛДЦПП па рэгіёнах Беларусі.



Малюнак 8 – Канцэнтрацыя занятасці і колькасць прадпрыемстваў ЛДЦПП па рэгіёнах Беларусі



Малюнак 9 – Канцэнтрацыя выпуску і колькасць занятых у ЛДЦПП па рэгіёнах Беларусі

Малюнак 9 сведчыць, што ў цэлым пацвярджаецца мэтазгоднасць вылучэння трох асноўных канцэнтрацыяў ЛДЦПП, дзе з найбольшай верагоднасцю можна знайсці існаванне узаемаадносінаў і паводзінаў прадпрыемстваў, якія б характарызаваліся кластэрнымі ўласцівасцямі. Ацэнка наяўнасці такіх уласцівасяў будзе зроблена ў наступным падраздзле.

Што датычыць ХНП, то гэтая галіна больш сціпла прадстаўлена ў Беларусі (малюнкі 10, 11).



Кожная кропка - 1 прадпрыемства ХНП

Малюнак 10 – Канцэнтрацыя выпуску і і колькасць прадпрыемстваў ХНП па рэгіёнах Беларусі

Як і ў выпадку Польшчы, хімічны і нафтахімічны сектар Беларусі сканэнтраваны ў асноўным у вялікіх гарадах Беларусі, або ў непасрэднай блізкасці ад іх. Найбольшая колькасць прадпрыемстваў у Мінску (110), Гомелі (46), Віцебску (20), Гродна (19). Асобны выпадак – такія гіганты, як «Белкалій», адзінае хімічнае прадпрыемства Салігорска, на якім у 2004 г. было занята 18,9 тыс. чалавек.

На малюнку 11 прадстаўлена канцэнтрацыя выпуску і колькасць занятых у ЛДЦПП па рэгіёнах Беларусі.



Малюнак 11 – Канцэнтрацыя выпуску і колькасць занятых у ХНП па рэгіёнах Беларусі

Належыць адзначыць, што статыстычныя даныя па прамысловасці прадстаўляюцца толькі ў разрэзе гарадоў рэспубліканскага падпарадкавання, таму у асобных раёнах (напрыклад, Лідскім, да якога адносіцца даволі буйное прадпрыемства «Лідская лакафарба» г. Ліды, і Светлагорскім, дзе ў г. Светалогрску знаходзіцца «Светалгоркское хімвалакно») назіраецца высокая шчыльнасць занятых у прамысловасці, хаця насамрэч уся прамысловасць сканцэнтравана ў горадзе. У прынцыпе гэта ж можна сказаць па кожнаму раёну, дзе адсутнічаюць асобныя даныя па гораду і тэрыторыі раёна.

Выяўленне канцэнтрацыі асобных галінаў і існавання патэнцыялу кластэру правядзём на прыкладзе прамысловасці Барысава, якая была даследавана больш

дэталёва. Вызначэнне паказальніка размяшчэння для Барысава сведчыць аб наяўнасці большай канцэнтрацыі асобных галінаў у рэгіёне ў параўнанні з краінай у цэлым (табліца 16).

Табліца 16 – Разлік паказальніка размяшчэння і ІСФЭ для галінаў прамысловасці Барысава ў 2003 г.

Галіны прамысловасці	К-ць прадпр.	Структура выпуску, %		Lq па выпуску	Структура занятасці, %		Lq па занятасці	ІСФЭ, %
		Барысаў	Краіна		Барысаў	Краіна		
Уся прамысловасць	45	100	100	1	100	100	1	100
Хімічная і нафтахім. (укл. хіміка-фармацэўт.)	5	20,2	11,9	**1,70**	11,9	9,5	**1,26**[1]	**149,5**[2]
хіміка-фармацэўт.	1	10,6	–	–	5,8	–	–	**169**
Машынабудаванне і металаапрацоўка	12	38,6	22,2	**1,74**	45,3	36,5	**1,24**	85
машынабудаванне	6	31,5	–	–	41,9	–	–	75
Лясная, дрэваапрацоўчая і цэл.-папяровая	9	13,8	5,1	**2,70**	13,7	10,6	**1,30**	101
дрэваапрацоўка	6	9,1	–	–	8,4	–	–	109
Будаўнічых матэрыялаў	3	7,6	3,7	**2,06**	7,2	4,8	**1,50**	105
шкляная і фарф.-фаянс.(з вытв. медвырабаў)	2	7,2	–	–	6,9	–	–	**130**
Лёгкая	5	0,9	6,9	0,12	3,9	13,5	0,29	22
Харчовая (*укл. мук.-круп.*)	6	17,8	21,5	0,83	5,5	11,8	0,47	246
мукамольна-крупяная	1	6,7	3,2	**2,10**	1,7	1,5	**1,13**	397
Іншыя	5	1,2	2,7	0,46	4,1	4,9	0,84	30

Крыніца: Разлічана на аснове статыстычных даных Мінскага абласнога камітэта статыстыкі і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Напрыклад, паказальнік размяшчэння ў Барысаве хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці (уключна з хіміка-фармацэўтычнай) разлічаны па спісачнай колькасці прамыслова-вытворчага персаналу (ПВПхім)

$$Lq^{\text{ПВПхім}}_{\text{Барысава}} = \frac{11{,}9\%}{9{,}5\%} = 1{,}26 \qquad (6)$$

Індэкс структурна-фактарнай эфектыўнасці хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці ($e_{\text{хім}}$) Барысава разлічаны пры экспертным дапушчэнні [42], што выпуск галіны толькі на

40% утвараецца за кошт працоўных рэсурсаў і на 60% – асноўным капіталам (іншымі словамі, галіна капіталаёмістая)

$$e_{\text{хім}} = \left(\frac{20,2\%}{11,9\%} \cdot 0,4 + \frac{20,2\%}{14,8\%} \cdot 0,6 \right) \cdot 100 = 149,5\% \qquad (7)$$

З табліцы 16 вынікае, што Барысаў мае яўную спецыялізацыю ў хіміка-фармацэўтычным сектары, машынабудаванні, дрэваапрацоўцы і шкляной прамысловасці, а таксама мукамольна-крупяной галіне (для гэтых падгалінаў *Lq > 1*). Ці пацвярджае гэта наяўнасць канкурэнтных перавагаў у нацыянальных і міжнародных маштабах у прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у дадзеныя галіны?

Каб адказаць на гэта пытанне, належыць правесці параўнанне адноснай эфектыўнасці прадпрыемстваў як у межах Барысава, так і краіны ў цэлым. Перш за ўсё, належыць адзначыць, што па ўсіх патэнцыйных кластэраўтваральных галінах каэфіцыент лакалізацыі па выпуску прадукцыі значна перавышае каэфіцыент лакалізацыі па занятасці. Гэта азначае, што сканцэнтраваныя ў рэгіёне прадпрыемствы маюць большую прадукцыйнасць, чым прадпрыемствы дадзеных галінаў у нацыянальных маштабах.

Іншымі словамі, параўнальная эфектыўнасць у нацыянальных маштабах прысутнічае, прычым па асобных сектарах даволі значная. Так, па хімічным і нафтахімічным сектары эфектыўнасць лакалізацыі ў 1,3 раза вышэйшая за нацыянальную (за кошт хіміка-фармацэўтычнай галіны), у лясной прамысловасці – 2,1 разы (за кошт дрэваапрацоўкі).

Цяпер належыць супаставіць вышэйадзначаныя ацэнкі для сектараў спецыялізацыі рэгіёна з іх параўнальнай эфектыўнасцю і яе дынамікай у межах Барысава. Для гэтага скарыстаем індэкс структурна-фактарнай эфектыўнасці (ІСФЭ).

Пазітыўная дынаміка ІСФЭ (яго рост або ўстойлівае знаходжанне на ўзроўні вышэй за сярэдні па прамысловасці) пацвярджае наяўнасць у Барысаве перавагаў па прадукцыйнасці для хіміка-фармацэўтычнага сектара, шкляной прамысловасці, дрэваапрацоўкі, а таксама мукамольна-крупяной галіны. Спецыфіка кожнай з гэтых галінаў дазваляе меркаваць аб розным характары ўзнікнення канкурэнтных перавагаў у іх межах.

Так, хіміка-фармацэўтычны сектар (РУП «Завод медпрэпаратаў») відавочна выкарыстоўвае (свядома або па збегу абставінаў) канкурэнтную *стратэгію спецыяліста («нішэра»).* Для дадзенай стратэгіі характэрны пошук вузкага сегмента рынку, які б задаволіў пяці ўмовам: забеспячэнне дастатковага патэнцыялу для атрымання

